РЭАЛІЗУЕМ АДОЗВУ ЦК І СНК АБ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

...ператары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гарному Каму ністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выдання—XV
№ 229 (4134)
Панядзелак 24 жніўня 1931 г.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА.

ПАД ДАХ САЎГАСНАЕ СТАДА—

АБАВЯЗАЛІСЯ НЕАДКЛАДНА ПАСТАВІЦЬ РАБОЧЫЯ САЎГАСАЎ „НЕГАРЭЛАЕ“, „ВЯЛІКІЯ НАВАСЕЛКІ“ І „РЫМЕ“

Новы этап у разьвіцьці грамадзкага харчаваньня

...рамадзкае харчаваньне зьяўляецца ...м з важнейшых вучасткаў рабо... на палянішэньні рабочага забесь...ньня, барацьбы за выкананьне ...фіцляну. Ня менш важную ро...гае грамадзкае харчаваньне, як ...ўны фактар перабудовы быту па ...х пачатках, як адна з умоў «пе...ду ад дробнай адзінкавай, хатняй ...адаркі да буйной, аграмаднай».

...нтральным Камітэтам УсеКП(б) ...ах прынята спэцыяльная пастана аб мерах палянішэньня грамадз... харчаваньня.

...та пастанова зьяўляецца адным з ...мантаў, які акрэсьлівае чарговыя ...лавыя задачы сацыялістычнага бу...ніцтва, дакумантам, ажыцьцяў...нем якога павінна бур'ёзна заняц...уся партыя.

...ав. Сталін у сваёй прамове, якая ...аналіз сучаснаму этапу нашага ...адарчага разьвіцьця і вызначыла ...каючыя адсюль практычныя зада...шмат увагі аддаў пытаньню палян...ньня культурна-бытавых і матар'...ных умоў рабочай клясы. Рэалізаз... гэтага ўказаньня правадыра пар...непарыўна зьвязана з вырашэнь...праблемы грамадзкага харчаван... з узьняцьцем усёй гэтай справы ...новую, найбольш высокую сту...

...астанова ЦК УсеКП(б) адкрывае ...ЫЯ ЭТАП у разьвіцьці грамадзкага ...аваньня, дае разгорнутую пра...му яго перабудовы на аснове ма...тага ўзрастаньня МАТАР'ЯЛЬНА-...НІЧНАЙ БАЗЫ. Размах будаўніц...новых устаноў грамадзкага хар...ньня відаць хаця-б з таго, што ...касьць тых, што абслугоўваюцца ...працягу бліжэйшых 2-3 год, павін...ьць падвоена і дасягнута вялізар...лічбы — 25 мільёнаў чалавек.

...акія тэмпы магчымы толькі ў кра... Саветаў, дзе партыя і ўрад ня...на клапоцяцца аб усямерным узь...ці матар'яльна-бытавога станоўі... шырокіх працоўных мас, дзе са...лістычная сыстэма народнай гас...ркі забясьпечвае паўхільнае па...ньне долі рабочых, калгасьнікаў ...дняцка-серадняцкай часткі адна...нікаў у разьмеркаваньні народ... даходу.

...галіне грамадзкага харчаваньня ...дасягнуты значныя посьпехі, але ...зусім невыстарчальны ў параў...ні з вялізарна-ўзрослымі патра...ньнямі працоўных мас. З другога ...паўстае ва ўсю шырыню пы...не аб рашучым выжываньні буй...ных недахопаў ва ўсёй рабоце ор...ў грамадзкага харчаваньня.

...адача карэннага палянішэньня і ...ымальнага разьвіцьця грамадзка... харчаваньня з усёй вострасьцю стаіць перад арганізацыямі КП(б)Б.

Грамадзкае харчаваньне складае «ахіллесову пяту» спажывецкай каапэрацыі БССР. Іменна тут перабудо...ва праходзіць ганебна маруднымі тэм...памі. Учора ў «Зьвязьдзе» былі апуб...лікаваны падрабязныя даныя аб ста...не грамадзкага харчаваньня ў БССР. Яны гавораць аб напўнасьці глыбокіх прарываў, патрабуючых неадкладных і самых рашучых мер да палянішэньня.

Зусім недапушчальным зьяўляецца такое становішча, што **рэарганізацыя грамадзкага харчаваньня ў аўтаномную сэкцыю ў сыстэме Белкаапсаюзу да гэтага часу яшчэ знаходзіцца на поўшляху, што Белкаапхарч яшчэ ня мае пастаяннага праўленьня**, а на мясцох замест 25 праўленьняў сэкцый створана ўсяго толькі 9.

Пры такім становішчы робіцца зусім зразумелымі тыя буйнейшыя прарэхі, якія ёсьць у рабоце органаў грамадзкага харчаваньня.

КАПІТАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА знаходзіцца пад ударам. На гэтыя мэты Белкаапсаюзам адпушчана ўсяго толькі 100.000 руб. замест прадугледжаных паводле пляну будаўніцтва 1.600 тыс. руб. Затрымліваюцца сродкі і па **рамонтныя** работы.

Вялікая неразьбярыха існуе ў пытаньні забесьпячэньня сеткі грамадзкага харчаваньня прадметамі **ТЭХНІЧНАГА АБСТАЛЯВАНЬНЯ І ІНВЭНТАРОМ.** Ёсьць нават абураючыя выкладкі **звароту** ў Маскву самага неабходнага інвэнтару, які дасылаўся ў парадку цэнтралізаванага забесьпячэньня.

ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК не прасякнут у работу органаў Белкаапхарчу, ня стаў тут асноўным мэтадам сацыялістычнага гаспадараньня. Чым можна апраўдаць такі факт, што нават у Менску з 60 сталовых, на гаспадарчы разрахунак пераведзены толькі 2?

Зусім натуральным рэзультатам усіх гэтых недахопаў зьяўляецца **НАДЗВЫЧАЙ НІЗКАЯ ЯКАСЬЦЬ РАБОТЫ СТАЛОВЫХ**, агідная пастаноўка ў іх справы. **Антысанітарны стан, чаргі, няўменьне з найбольшым эфэктам выкарыстаць наяўныя прадуктовыя запасы, ігнараваньне запатрабаваньняў спажыўца** — вось, што характарызуе работу большасьці сталовых і буфэтаў.

Патрэбна вялікая ўпартая работа, каб зьнішчыць усе гэтыя недахопы, каб цалкам задаволіць запатрабаваньні рабочага спажыўца.

Дзе хаваюцца карэньні прарываў у галіне грамадзкага харчаваньня?

Перш за ўсё ў **недахопах работы і кіраўніцтва Белкаапсаюзу і Белкаапхарчу.**

Вылучэньне Белкаапхарчу ў аўтаномную сэкцыю павінна было забясьпечыць яго найбольшую гаспадарчую самастойнасьць, палянішэньне і канкрэтызацыю апэрацыйнага кіраўніцтва нізавой сеткай. На справе-ж атрымалася, што Белкаапсаюз ня здолеў укамплектаваць органаў Белкаапхарчу неабходнымі **КАДРАМІ**, арганізацыйна замацаваць гэта новае аб'яднаньне, прадставіў яго самім сабе, без патрэбнага кіраўніцтва і дапамогі.

Безініцыятыўнасьць, бездапамоснасьць і роспач адчуваюцца і з боку самога Белкаапхарчу і яго органаў на мясцох.

Часу з моманту пастановы ЦК КП(б)Б аб перабудове каапэрацыі прайшло больш, чым даволі, каб забясьпечыць рашучыя зрухі ў гэтай рабоце і апраўдаць абураючыя недахопы ў пастаноўцы грамадзкага харчаваньня нічым нельга.

Зусім недапушчальным зьяўляецца і такое становішча, што **ПАРТЫЙНЫЯ, ПРАФЭСЫЯНАЛЬНЫЯ І САВЕЦКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ Ў ЦЭЛЫМ РАДЗЕ ВЫПАДКАЎ НЯ ЦІКАВЯЦЦА ПЫТАНЬНЯМІ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ**, пакідаюць гэту работу па-за сваім кіраўніцтвам.

Неадкладна павінны наблізіцца да справы **САНІТАРНАГА КАНТРОЛЮ** пад сталовымі органы НК Аховы Здароўя.

Трэба рашуча ўзяць курс на поўнае ажыцьцяўленьне ўказаньня ЦК УсеКП(б) — **«ня гнацца за павялічэньнем колькаснага ахопу абедаючых за кошт пагаршэньня якасьці абедаў і ўстаноўленых норм па грамадзкім харчаваньні».** Іменна гэты недахоп характэрны для беларускіх арганізацый грамадзкага харчаваньня. Вялікі колькаспы рост сеткі (павялічэньне ліку сталовых у 1931 годзе да 235 супроць 181 у 1930 годзе) ня суправаджаўся неабходным уздымам **ЯКАСНЫХ ПАКАЗАЛЬНІКАЎ** яе работы.

Пастанова ЦК УсеКП(б)Б вызначыла канкрэтныя мерапрыемствы па ўзьняцьці вытворча-тэхнічнай базы грамадзкага харчаваньня, па пашырэньні сеткі сталовых, іх абсталяваньня, падрыхтоўкі кадраў і г. д.

На аснове гэтай пастановы органы каапэрацыі, пад кіраўніцтвам партыі і пры дапамозе пралетарскай грамадзкасьці, вядучы барацьбу з апартуністычным замарожваньнем тэмпаў, з практыкай адставаньня — павінны ў бліжэйшы-жа перыяд часу дабіцца карэннага палянішэньня ў пастаноўцы грамадзкага харчаваньня, поўнага падначаленьня гэтай работы патрабаваньням сацыялістычнага будаўніцтва.

Запэўняем партыю і ўрад:

прамфінплян выканаем і перавыканаем

Рабочы калектыў і агратэхнічны пэрсанал чырвона-штандарнага жывёлагадоўчага саўгасу **«ВЯЛІКІЯ НАВАСЕЛКІ»**, абмеркаваўшы адозву партыі і ўраду аб жывёлагадоўлі, узяў на сябе наступныя абавязкі.

На сёнешні дзень саўгас мае 212 шт. буйной рагатай жывёлы, 78 шт. маладняка, 59 цялят.

Удой ад аднэй каровы ў сярэднім зараз дасягае 5 літраў у дзень. Рабочы калектыў абавязаўся **ЎЗЬНЯЦЬ УДОЙНАСЬЦЬ АД КОЖНАЙ КАРОВЫ ДА 7 ЛІТРАЎ І ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН ЗДАЧЫ ТАВАРНАЙ ПРАДУКЦЫІ.**

Для забесьпячэньня пагалоўя кармамі **засіласаваць 600 тон, павялічыўшы плян** сіласаваньня на 20 проц. **І загатовіць у калгасах 100 тон саломы і 44 тоны сена.** Пры кармленьні жывёлы цьвёрда прытрымлівацца вызначаных норм.

Да 1-га ВЕРАСЬНЯ ЗАКОНЧЫЦЬ БУДАЎНІЦТВА АБОРЫ НА 60 ШТ., А ДА 1-га КАСТРЫЧНІКА НА 200 ШТ. АБСТАЛЯВАЦЬ ЦЯЛЯТНІК НА 100 ШТ.

Рабочых, занятых на аборах, аплачваць як па колькасьці, так і па якасьці іх работы. Для ўзьняцьця кваліфікацыі рабочых скотнага двара правесьці месячныя курсы.

Рабочы калектыў і тэхнічны пэрсанал жывёлагадоўчага саўгасу «Вялікія Навасёлкі», запэўняе партыю і ўрад у тым, **ШТО ПРАМФІНПЛЯН САЎГАСУ БУДЗЕ НЯ ТОЛЬКІ ВЫКАНАН, АЛЕ І ПЕРАВЫКАНАН.**

Па даручэньні агульнага сходу:
Сакратар ячэйкі КП(б)Б ШАБУНЯ.
Старшыня Рабачкому СВАРЧЭЎСКІ.

600 новых сьвінаводчых фэрм арганізаваць у калгасах

У выкананьне адозвы ЦК КП(б)Б і СНК БССР Сьвінаводкалгасцэнтрам ужо даводзен да рабіну падатковы плян па арганізацыі 600 сьвінаводчых таварных калгасных фэрм з пагалоўем у 36 тыс. сьвінаматак.

Плян арганізацыі асеньняй злучкі і апаросу прадугледжвае атрыманьне прыплоду ў 324 тыс. парасят па 4 таварн. сьвіньні ад кожнай сьвінаматкі.

Раёнам дана заданьне арганізаваць 25 племанных сьвінаводчых фэрм на 2.500 сьвінаматак.

Для фарсаваньня работы па камплектаваньні і здачы таварнай прадукцыі ў раёны накіраваны 52 чал. з курсаў партактыву пры ЦК КП(б)Б.

Узьнімем таварнасьць

Прапрацаваўшы адозву ЦК і СНК аб разгортваньні жывёлагадоўлі, агульны сход рабочых саўгасу НЕГАРЭЛАЕ, для ажыцьцяўленьня гэтага мерапрыемства пастанаўляе:

Для сваячасовага сканчэньня будаўніцтва ў саўгасе патрабаваць ад Белсельбуду 250 рабочых адначасова пасла...ць 6 брыгад у раёны і сельсаветы для вярбоўкі рабочай сілы.

Арганізаваць брыгады для прыёму сьвінаматак ад Койданаўскага аддзяленьня Белмяса з такім разьлікам, каб у жніўні скончыць камплектаваньне.

Для ліквідацыі прарыву па адкорме заключыць умову з Белмясам аб дастаўцы для адкорму 250 сьвіней.

Правесьці на працягу 2-х месяцаў механічнае водазабесьпячэньне, варку і падачу корму ў сьвінарнікі.

На працягу 5-ці дзён ліквідаваць абязьлічку, прымацаваўшы да пэўнай колькасьці сьвіней сталых рабочых.

Агульны сход рабочых запэўняе ЦК КП(б)Б і СНК БССР, што заданьне па здачы таварнай прадукцыі саўгас выканае.

Па даручэньні сходу:
Сакратар парткома — РАДЧЭНКА
Дырэктар саўгасу — ПІШЧУК
Рабачком — ЛІШНЯВЕЦ.

ДЭКАДНЫ ПЛЯН КАМПЛЕКТАВАНЬНЯ

павінен мець кожны саўгас

1 кастрычніка — апошні тэрмін укамплектаваньня саўгасаў Сьвінавода. Між тым на сёнешні дзень плян камплектаваньня выканан толькі на 51,8 проц. Укамплектаваньне паогул ідзе самацёкам. **Частка саўгасаў дагэтуль ня мела ўпаўнаважаных, якія-б адказвалі за ўкамплектаваньне стада.** А там, дзе ўпаўнаважаныя і былі вылучаны, яны нічога не рабілі.

Прыкладам можа паслужыць сьвінагадоўчы саўгас у Мсьціслаўскім раёне, які ня змог загатовіць сьвінаматак. У той-жа час з Ленінграду ў Мсьціслаўскі раён прыехала спэцыяльная брыгада і поўнасьцю выканала свой плян загатовак сьвінаматак.

Кожны саўгас павінен мець дэкадны плян укамплектаваньня.

Выгадаваць 265.000 цялят

У КАЛГАСАХ БССР

АРГАНІЗАВАЦЬ 900 ЦЯЛЯЧЫХ ФЭРМ

ЦК КП(б)Б і СНК БССР у сваёй адозве аб разгортваньні жывёлагадоўлі ў Савецкай Беларусі паставілі перад калгаснай сыстэмай, побач з радам іншых мерапрыемстваў, наступную задачу—**ВЫГАДАВАЦЬ У КАЛГАСАХ НА ПРАЦЯГУ 1931 ГОДУ 265 ТЫС. ЦЯЛЯТ.**

Гэта колькасьць цялят павінна быць сканцэнтравана ў калгасах наступным чынам: прыплод ад абагуленых кароў—83 тысячы, абагульваньне і купля ў калгасьнікаў — 98 тыс. і купля праз аддзяленьні Белмяса — 84 тыс.

Гэтыя цялята павінны гадавацца ўсімі, бяз выключэньня, калгасамі незалежна ад напрамку гаспадаркі.

АПРАЧА ТАГО Ў БЛІЖЭЙШЫ-Ж ЧАС ТРЭБА АРГАНІЗАВАЦЬ НЯ МЕНШ 900 ФЭРМ ПА ГАДАВАНЬНІ ЦЯЛЯТ І МАЛАДНЯКА НА 100 ТЫСЯЧ ШТУК.

Арганізацыя гэтых фэрм і іх камплектаваньне мае выключнае значэньне для далейшага разгортваньня малочна-таварных фэрм. Цялячыя фэрмы павінны арганізоўвацца так, каб потым яны перарасталі ў малочна-таварныя фэрмы. Гэта значыць, што ўжо зараз, пры адборы калгасаў для арганізацыі такіх фэрм неабходна будзе вынучаць пэрспэктывы для арганізацыі малочна-таварнай фэрмы ў гэтым калгасе. Як арганізаваць цялячую фэрму? Фэрма арганізуецца па прынцыпе малочна таварнай фэрмы і дзейнічае на падставе дагавору калгасу з Малакокалгасцэнтрам і зьяўляецца ўласнасьцю і прадпрыемствам калгасу.

Задача фэрмы — гадаваць высокапрадукцыйных кароў для гэтага-ж калгасу з мэтай арганізацыі малочнай таварнай фэрмы.

Калгас павінен укамплектаваць фэрму цялятамі, як за кошт абагульваньня так і шляхам куплі ў Белмяса, пабудаваць або прыстасаваць памяшканьні, забясьпечыць фэрму кармамі, рабочай сілай і г. д.

Малакокалгасцэнтр з свайго боку абавязуецца дапамагчы фэрме атрымаць цялят ад Белмяса, выдаць крэдыт на ўкамплектаваньне і будаўніцтва, арганізаваць зоавэтдапамогу.

Цялячыя фэрмы па атрыманьні ільгот прыраўніваюцца да МТФ.

Наркамзэм і Белкалгасцэнтрам ужо даны раёнам канкрэтныя паказаньні аб арганізацыі фэрм па гадаваньні цялят і маладняка з тым, каб да 1-га верасьня закончыць афармленьне гэтых фэрм і заключыць з імі дагавары.

Райкалгасаюзы і Райупаўнаважаныя Малакокалгасцэнтру павінны зараз-жа вызначыць калгасы, у якіх магчыма арганізаваць цялячыя фэрмы, разгарнуць шырокую растлумачальную работу сярод калгасьнікаў. Дагавары аб арганізацыі фэрм павінны абгаварвацца на калгасных сходах пры шырокім удзеле калгасных мас.

Кулацкія элемэнты бязумоўна паспрабуюць скарыстаць адсталую частку калгасьнікаў каб сарваць арганізацыю фэрм. **Такім спробам кулаку трэба будзе адразу-ж даць рашучы адпор, растлумачыўшы калгасьнікам і калгасьніцам, ШТО ГАДАВАЦЬ ЦЯЛЯТ І КАРОЎ ЯНЫ БУДУЦЬ ДЛЯ СЯБЕ-Ж.**

ГРЫНЕВІЧ.

За 12 таварных сьвіней

Агульны сход рабочых і тэхнэрсаналу сьвінасаўгасу **«РЫМЕ»**, абгаварыўшы адозву партыі і ўраду аб разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі, узяў на сабе наступныя абавязкі:

Да 1-га верасьня закончыць укамплектаваньне саўгасу, атрымаўшы 182 сьвінаматкі ад аддзяленьня Белмяса. Здаць таварнай прадукцыі дзяржаве—**У ВЕРАСЬНІ 52 ШТ. І У СЬНЕЖНІ 486 ШТ.** Дабіцца выхаду таварных парасят па менш, як па 6 таварных сьвіней ад кожнай сьвінаматкі, зьнізіўшы адыход маладняка да 7 проц.

Да 1-га студзеня атрымаць ня менш, **ЯК 1.575 ПАРАСЯТ** (павінна апарасіцца 262 сьвінаматкі).

У дакадны тэрмін ліквідаваць абязьлічку на сьвінарніках, разьмеркаваўшы ўсё сьвіное пагалоўе па групах і ўзростах і прымацаваць да сьвінарнікаў і сьвіней сталых работнікаў. Увесьці прагрэсыўна - зьдзельную аплату за якасьць работы і прэміяваньне за лепшыя паказальнікі.

З 1-га верасьня адкрыць месячныя курсы для малодшых сьвінароў па тэхніцы сьвінагадоўлі і прафілактыцы, **ПАДРЫХТАВАЦЬ 2-Х СТАРЭЙШЫХ СЬВІНАРОЎ З УДАРНІКАЎ І ЎДАРНІЦ.**

Наладзіць вучот работы на сьвінарніках з такім разьлікам, **КАБ КОЖНЫ ДЗЕНЬ ДА 8 ГАДЗІН ВЕЧАРА МЕЦЬ ПОЎНЫ МАЛЮНАК ХОДУ ВЫКАНАНЬНЯ ПРАМФІНПЛЯНУ І ВЫПРАЦОЎКІ КОЖНАГА РАБОЧАГА.** Пастаніць пытаньне аб пераводзе сьвінагадоўчага цэху з 1-га кварталу 1932 году на гаспадарчы разьлік.

Для забесьпячэньня пагалоўя кармамі выканаць плян сіласаваньня ў 33 тоны не пазьней 20-га верасьня. Ўборку кораньклубняплоду дачаць 15 верасьня і скончыць не пазьней 15 кастрычніка. Правесьці пасеў азімых на плошчы 85 гэкт., з якіх — выпасаў для сьвіней 21 гэкт.

Каб да 1-га лістапада закончыць будаўніцтва сьвінарнікаў уставаніць сталы рабочы кантроль за ходам будаўніцтва.

Саўгас «Рыме» выклікаў на сацспаборніцтва саўгасы **«Івань» і імя 14 партызан** Слуцкага раёну.

Па даручэньні агульнага сходу:
Дырэктар саўгасу КУРЛОВІЧ
Сакратар сельпарткому КЛЮЙКО
Старшыня рабачкому СУХАВЕР.

Ударніца-даярка за работай.

Ударнікі сьвінагадоўлі

КАЛГАСЬНІКІ З КАЛГАСУ «НА ВАРЦЕ», АБГАВАРЫЎШЫ НА АГУЛЬНЫМ СХОДЗЕ АДОЗВУ ЦК УсеКП(б) і СНК СССР, ПАСТАНАВІЛІ:

ПАВОДЛЕ ПЛЯНУ МЫ ПАВІННЫ СЁЛЬТА ПАСТАВІЦЬ НА ФЭРМЫ 130 СЬВІНАМАТАК І ЗДАЦЬ ДЗЯРЖАВЕ 6 АДКОРМЛЕНЫХ СЬВІНЕЙ. НА СЁНЕШНІ ДЗЕНЬ МЫ ЎЖО МАЕМ 82 СЬВІНАМАТКІ. 7 СЬВІНЕЙ ДЛЯ АДКОРМУ І 15 ПАДСЬВІНКАЎ.

МЫ ЗАПЭЎНЯЕМ ПАРТЫЮ І ЎРАД, ШТО ДА КАНЦА ГОДУ ПЛЯН БУДЗЕ НАМІ НЯ ТОЛЬКІ ВЫКАНАН, АЛЕ І ПЕРАВЫКАНАН. АПРАЧА ТАГО, МЫ СТАВІМ НА АДКОРМ 6 КАРОЎ, А 15 ЦЕЛАК АБМЕНЬВАЕМ НА СЬВІНАМАТКІ.

МЫ БУДУЕМ 2 СЬВІНАРНІКІ НА 160 МЕСЦ. СКАНЧЭНЬНЕ ІХ ЗАЦЯГВАЛАСЯ З ПРЫЧЫНЫ АДСУТНАСЬЦІ ЦЬВІКОЎ, АЛЕ МЫ РАШЫЛІ ЗА МЕСТ ЖАЛЕЗНЫХ ЦЬВІКОЎ СКАРЫСТАЦЬ ДРАЎЛЯНЫЯ. ПАВУДОВУ СЬВІНАРНІКАЎ СКОНЧЫМ АДНАГО ДА 1-ГА ВЕРАСЬНЯ І ДРУГОГА ДА 1-ГА КАСТРЫЧНІКА. ДА ГЭТАГА-Ж ЧАСУ АБСТАЛЮЕМ КАРАНЦІН, ІЗАЛЯТАР І КУХНЮ ДЛЯ СЬВІНЕЙ.

ДЛЯ ЗАКЛАДКІ 150 ТОН СІЛАСУ І КАПАНЬНЯ СІЛАСНЫХ ЯМ МЫ ПРАВОДЗІМ ДВА НЯДЗЕЛЬНІКІ.

МЫ АБВЯШЧАЕМ СЯБЕ ЎДАРНІКАМІ СЬВІНАГАДОЎЛІ І ВЫКЛІКАЕМ НА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА СЬВІНАВОДЧЫ КАЛГАС ІМЯ ДЗЯРЖЫНСКАГА —ПЛЕШЧАНІЦКАГА РАЁНУ І КАЛГАС «БЕЛАРУСКАЯ ВЁСКА» — БЯГОМЛЬСКАГА РАЁНУ.

Па даручэньні агульнага сходу калгасьнікаў:
Старшыня калгасу МАЛЯРОЎ
Сакратар — СТАВЭР.
Вёска Навасёлкі, Бягомльскага раёну.

Усебеларускі конкурс на лепшыя калгасныя фэрмы

Капыль уключыўся ў конкурс

КАПЫЛЬ. КАПЫЛЬСКІ РАЁН УКЛЮЧЫЎСЯ ВА ЎСЕБЕЛАРУСКІ КОНКУРС НА ЛЕПШЫЯ КАЛГАСНЫЯ ФЭРМЫ, УЖО АРГАНІЗАВАНА РАЁННАЕ КОНКУРСНАЕ БЮРО.

НАРАДА АГРАНОМАЎ СПЭЦЫЯЛІСТАЎ, ЯКАЯ АДБЫЛАСЯ ГЭТЫМІ ДНЯМІ АБВЯСЬЦІЛА СЯБЕ ЎДАРНАЙ НА ЛЕПШАЕ І ХУТЧЭЙШАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ Ў ЖЫЦЬЦЁ АДОЗВЫ ЦК І СНК АБ РАЗГОРТВАНЬНІ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ.

РЭДАКЦЫЯ ГАЗЭТЫ «КАЛГАСЬНІК КАПЫЛЬШЧЫНЫ» АБАВЯЗАЛАСЯ ШЫРОКА АСЬВЯТЛЯЦЬ НА СВАІХ СТАРОНКАХ ХОД КОНКУРСУ НА ЛЕПШЫЯ ФЭРМЫ І АДНАЧАСОВА ПАКАЗАЦЬ ЯК ТАЯ, ЦІ ІНШАЯ ФЭРМА ДАСЯГНУЛА ПОСЬПЕХАЎ У СПРАВЕ ЎЗЬНЯЦЬЦЯ ТАВАРНАСЬЦІ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ.

В.

Машыны—уборачнай

КОЖНАЙ ІЛЬНАЦЕРАБІЛЦЫ—

максымальную нагрузку ФАРСАВАЦЬ ВЫПУСК

ІЛЬНАМАЛАТАРАНЬ „ЭДДЗІ“

Частка ільнацерабілак злачынна не скарыстоўваецца

...водле бостак Наркамзему ў БССР ...завезена каля 230 ільнацерабілак па ...МТС і саўгасаў.

...натпікіла паведамленьні нашых бры...даў і карэспандэнтаў сьведчаць аб ...што гэта ВЯЛІЗАРНАЯ КОЛЬ...ЬЦЬ ІЛЬНАЎБОРАЧНЫХ МАШЫН ...МНОГІХ МЯСЦОХ СКАРЫСТОЎВА... ЗУСІМ НЕРАЦЫЯНАЛЬНА. ...ь і ўсюды ільнацерабілкі не пра...ь, з прычыны адсутнасьці пасаў, ...кі тых ці іншых частак і г. д.

...ба падкрэсьліць, што ў радзе вы...ў ільнацерабілкі былі сапраўды ...жаны без пасаў, з паламанымі ...кмі і г. д.

...е ў асноўным ня гэта зьяўляецца ...ынай нерацыянальнага скарыстоў...ня машын. Галоўная бяда ў тым, ...АДМІНІСТРАЦЫЯ МТС І САЎГА... НЕ ПРАЯЎЛЯЕ НІЯКАЙ ІНІЦЫЯ...ЫІ, КАБ УЛАСНЫМІ СРОДКАМІ ...РАВІЦЬ ТЫЯ ЦІ ІНШЫЯ ДРОБ...ДЭФЭКТЫ Ў ІЛЬНАЦЕРАБІЛ...

Устанавіўся парадак, што калі ...церабілка прыбыла без поўнай ...і, або трэба не адрамантаваць, дык ...або саўгас лічыць, што гэта справа ...у і пакуль завод не паправіць, або ...шле частак, самім рабіць нічога ня ...

...ыкладам такіх проста злачынных ...ін да ільнакарыстоўваньня машын ...ыць саўгас «БІГОСАВА», які атры...2 ільнацерабілак. З-ЗА АДСУТ...ЬЦІ ЛАНЦУГОЎ І ІНШЫХ ДРОБ...ЧАСТАК, ЯНЫ НЕ СКАРЫС...ЛЯЮЦЦА. Дырэктар саўгасу нічога ...этнага не зрабіў, каб дастаць не...ныя часткі і папарвіць ільнацера...ы. У выніку ЎБРАНА ЎСЯГО 12 ...АНТАЎ ІЛЬНАПАСЕЕАЎ — 100 ... замест 700.

...саўгас «БОРКАВІЧЫ» такі-ж мало...нак. Тут ёсьць 39 ільнацерабілак. З 1.100 гэкт. ільну ўбрана... 76 гэкт.

Усё яшчэ ДРЭННАЯ справа З ВЫРАБАМ ІЛЬНАМАЛАТАРАНЬ «ЭДДЗІ». Белсамрамсаюз на сёнешні дзень ВЫПУСЬЦІЎ ТОЛЬКІ 30 МАЛАТАРАНЬ замест неабходных 300. Тлумачыцца гэта ў асноўным тым, што ЗАВОД «КАМУНАР» на выконае свайго абавязацельства аб выпуску валаў для гэтых малатарань.

Трэба мабілізаваць увагу рабочай грамадзкасьці заводу «Камунар» вакол выкананьня заказу на валы з тым, каб яны былі зроблены ў самыя бліжэйшыя дні.

Што датычыць ільнацерабілак, дык тут неабходна прыняць самыя рашучыя меры супроць тых, хто не скарыстоўвае гэтых машын, не праяўляе ініцыятывы на месцы, каб паправіць тыя ці іншыя недахопы ў ільнацерабілках. Органы ЦКК-РСІ абавязаны высьветліць кожны канкрэтны факт нескарыстаньня ільнацерабілак і прыцягваць вінаватых да суровай адказнасьці.

Лён перастаяў

ТАЛАЧЫНО. У радзе калгасаў Старасельскага сельсавету лён перастаяў ужо на полі, а да ўборкі яшчэ не прыступаюць. Такое становішча, напрыклад, у калгасе «Бальшавік». Праўленьне калгасу на чале з старшынёй Зэлікавым замест арганізацыі баявой ільнаўборкі, займаецца п'янствам. Гэтае-ж самае адбываецца ў калгасе «Чырвонае поле».

Неабходна самым жорсткім чынам рэагаваць на такую злачынную практыку праўленьняў гэтых калгасаў, якія робяць фактычна кулацкую справу.

А. ГЕНІН.

Раўняцца па перадавых

ВУШАЧЫ. (Наш кар.). На 15 жніўня па раёне ўбрана 20,6 проц. ільну. Зрух яўна невыстарчальны. Значная частка калгасаў яшчэ адстае ва ўборцы. Рад калгасаў, аднак, паказваюць прыклад барацьбы за лён. Так, калгасы «Бальшавік», Плінскага сельсавету, і «Чырвоны камбайн», Жарскага сельсавету, 17 жніўня **скончылі ільнацерабленьне.** Калгас «Новы шлях», Сарачынскага сельсавету, на 17 жніўня **ўбраў 75 проц.** ільну і значную частку **ўжо намачыў.** Да 1 верасьня калгас мяркуе здаць частку апрацаванага ільну дзяржаве. Нормы зьдзельшчыны ў гэтым калгасе сыстэматычна перавыконваліся.

Праз раённую газэту калгас «Чырвоны кастрычнік» зьвярнуўся з адозвай да ўсіх калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў — аднаасобнікаў, у якой заклікае датэрмінова скончыць церабленьне ільну. Сам калгас абавязаўся: да 1-га верасьня поўнасьцю ўбраць, намачыць і разаслаць лён.

Калгас прыняў наступныя нормы выпрацоўкі: на церабленьне 1 гэкт. ільну — 12 чалавек; на аднаго работніка абмалаціць рукамі 200 снапоў ільну; намачыць — 600 снапоў; разаслаць мокрага ільну 180 снапоў, сухога — 270 снапоў.

У калгасе для прэміяваньня лепшых ударнікаў створан фонд у суме 300 р.

Адстаючыя калгасы Вушацкага раёну павінны ўзяць прыклад з калгасаў, якія скончылі раней тэрміну ўборку ільну. На адозву калгасу «Чырвоны Кастрычнік» трэба адказаць канкрэтнымі мерапрыемствамі, якія забясьпечаць посьпех ільнаўборачнай.

Я. Ліпаўка.

Залежы ўгнаеньняў і машын

ВУЗДА. На складзе Вузьдзенскага райсаюзу ёсьць нерэалізаваных сельгасмашын больш чым на 30.000 руб. Многія машыны бяз частак. Ляжыць таксама 15 вагонаў фасфарытнай мукі. Прыбывае новае ўгнаеньне. Трэба прымусіць зямельна-калгасна-каапэрацыйныя арганізацыі прынядь належныя меры, каб рэалізаваць залежы.

Брыгадзір «Зьвязды» ШУСТРЫ.

Машыны не адрамантаваны

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА. Надышла асеньняя сяўба. Але калгас **«Майскі прамень»**, Чырвона-Слабодзкага раёну, яшчэ ня думаў рыхтаваць с.-г. машыны да сяўбы. **Радковыя трактарныя сэвяркі валяюцца пад адкрытым небам** аж ад самай веснавой сяўбы. Пружыноўкі, бораны і плугі ляжаць на двары пад дажджом і наіржавелі.

Тое-ж самае і з іншымі с.-г. машынамі. Аж ад мінулага году стаіць каля сіласнай ямы сячкарня. Па сканчэньні ўборкі сенажаці касілкі і кожныя граблі былі пакінуты на двары.

Праўленьне калгасу «Майскі прамень», якое дапускае такую злачынную безгаспадарчасьць, павінна быць прыцягнута да адказнасьці.

АЛЕСЬ СЯЧКО.

АСЕНЬНЯЯ ПАСЕЎКАМПАНІЯ

ТЭМПЫ СЯЎБЕ

Неадкладна рэалізаваць машыны і угнаеньне

Пашыраем азімы клін за кошт бросавай зямлі

БЯЛЫНІЧЫ. КАЛГАС ІМЯ СТАЛІНА на пляне райкалгассаюзу ПАВІНЕН ЗАСЕЯЦЬ 43 ГЭКТ. ЖЫТА. Калгас выканаў сустрэчны плян — засеяць 80 ГЭКТ. Пашырэньне азімага кліну будзе зроблена цалкам за кошт бросавай зямлі. 20 жніўня калгас пачаў сяўбу.

МЕЛІХАЎ.

Чакаюць „прачыстых“

ЛЕПЕЛЬ. (Наш спэц. кар.).

Калгасамі пляны ўзьняцьця папару перавыкананы — узьнята 10.865 гэкт замест 8.289. Плян перавыкананы на 31,1 проц. Аднак, аднаасобнікі некалькі адстаюць. Замест 3.021 гэкт. узьняла толькі 2.847 гэкт. папару — 94,2 проц.

Ня гледзячы на тое, што калгасы пад рыхтаваны да сяўбы, усё-ж сяўба пораёне не пачалася. «Калгасьнікі па старой традыцыі чакаюць часу сяўбы, як вызначаецца днём пейкага сьвята» — так тлумачыць загадчык раёна.

Хоць пляны сяўбы і даведзены да сельсаветаў і калгасаў, але нічога практычна ня зроблена, каб пачаць сяўбу ў тэрмін, каб шырокай растлумачальнай работай перамагчы «традыцыйныя» настрої, на якія скардзіцца загадчык раёна.

Не чакаючы ніякіх «прачыстых», азімыя павінны быць засеяны ў тэрміны, паказаныя ўрадам.

А. МІКУЦКІ.

Linnahall kalibroovimisribad LRT-BE4-V2

Бабруйскі партактыў абавязаўся ліквідаваць прарывы

РАЁННАЯ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ МАЕ ЎСЕ МАГЧЫМАСЬЦІ ДЛЯ ТАГО КАБ КРУТА ЎЗЬНЯЦЬ ТЭМПЫ ВЫКАНАНЬНЯ ПРАМФІНПЛЯНУ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

РАЗГАРНУЦЬ РАБОТУ НОВЫМІ МЭТАДАМІ, НОВЫМІ ТЭМПАМІ—У ГЭТЫМ ЗАРУКА ЗЬНІШЧЭНЬНЯ ГАНЕБНАГА АДСТАВАНЬНЯ

19-го жніўня адбыўся сход раённага актыву Бабруйскай партыйнай арганізацыі.

З дакладам аб становішчы і задачах арганізацыі выступіў загадчык арг. аддзелу ЦК КП(б)Б тав. Гантман.

— На ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва мы затрымалі вялікія перадовыя. Наша краіна ператвараецца ў краіну самай буйной, самай перадавой сельскай гаспадаркі. Сацыялістычны сэктар даў асноўным вытвярцам ня толькі хлеба, але і тэхнічных культур.

Кінуты партыяй лозунг аб ператварэнні вясковыя сяўбы гэтага году ў другую бальшавіцкую вясну быў падтрыманы мільёнамі. Посьпехі веснавой сяўбы відавочны. Значна ўзрасла і ўмацавалася сацыялістычная прамысловасьць, краіне, такім чынам, адбыліся вялікія сацыяльна-эканамічныя зрухі.

Перад партыяй і перад краінай зараз стаяць вялікай важнасьці гістарычныя задачы.

Выкананьне гэтых задач патрабуе ад ветаў, партыі, прафсаюзаў, камсамолу лучай перабудовы сваёй работы пановому — новымі мэтадамі, новымі тэмпамі.

Бабруйская партарганізацыя ў аўладала новымі тэмпамі

Гаворачы аб становішчы работы Бабруйскай партыйнай арганізацыі тав. Гантман падкрэсьлівае, што яна Бабруйская арганізацыя не перабудавала сваю работу па-новаму, не ўладала новымі тэмпамі.

Бабруйская арганізацыя мае буйныя прарывы ў выкананьні раду гаспадарчалітычных задач.

ЦК КП(б)Б лічыць, што Бабруйская партарганізацыя па рашаючых участках сацыялістычнага будаўніцтва здала тэмпы.

Асноўныя вядучыя заводы Бабруйску ня выходзяць з прарываў.

Дрэваапрацоўчы камбінат — гэты буйнейшы завод усесаюзнага значэньня, за першае паўгодзьдзе выканаў прамфінплян толькі на 70,2 проц. Гэта значыць, не дадаў дзяржаве 240 тыс. рубляў. Асноўныя і бадай важнейшыя цэхі камбінату даюць зусім нізкі процант выканаўня пляну: лесазавод № 7 — 53 проц., фанэрны завод — 51 проц.

На 9-га жніўня 1931 г. толькі адзін лесацех выканаў прамфінплян, даўшы 100,7 проц. Астатнія цэхі па-ранейшаму даюць 67,5 проц., 57,7 проц., 57,1 проц. і г. д.

Бабруйскі камбінат на асобных відах экспарту займае бадай першае месца ў Саюзе. Камбінат павінен забясьпечыць стандартнымі дамамі такія прамысловыя цэнтры, як Данбас.

Ня гледзячы на такое вялікае значэньне камбінату, партыйная арганізацыя і першую чаргу РК, не аддавалі гэтаму прадпрыемству патрэбнай увагі.

За апошні час у работе камбінату ёсьць некаторае паляпшэньне, але гэта паляпшэньне далёка ад рашучых крокаў і тым больш ад пералому.

Чыгуна-ліцейны завод імя Сталіна па сваёй вялічыні і ўдзельнай вазе займае у Бабруйску другое месца пасьля камбінату. Гэты завод за першае паўгодзьдзе выканаў прамфінплян усяго на 48,52 проц.

Гэтыя прарывы сьведчаць аб тым, што партарганізацыі важнейшых прадпрыемстваў ня здолелі мабілізаваць масы па барацьбу за поўнае выкананьне пляну, не ўзначалілі ініцыятывы і энэргіі рабочых мас.

Раён калектывізаваны толькі на 21 проц.

Бабруйская арганізацыя асабліва дрэнна разгортвае работу на фронце сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

У той час, як па БССР сярэдні процант калектывізацыі дасягнуў 45,5 проц., Бабруйскі раён калектывізаваны на 21 проц. Калі адкінуць цэлы рад адзіночак служачых, батракоў, якіх нельга лічыць як гаспадароў, дык процант калектывізацыі будзе ня больш 19 проц. Па БССР бадай няма раёну з такім нізкім процантам.

Гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў — поўнае ўвядзеньне зьдзельшчыны, правільная арганізацыя працы, ліквідацыя абязьлічкі, разьмеркаваньне даходаў па працадніёх — зьяўляецца важнейшай задачай кожнай партыйнай арганізацыі, кожнай калгаснай ячэйкі.

— Я павінен адзначыць, — гаворыць тав. Гантман, — што партыйныя ячэйкі на вёсцы не павярнуліся тварам да выкананьня гэтай важнейшай задачы.

Цэлы рад партыйных ячэек барацьбу за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў не паставілі як вузлавую задачу.

Бабруйская партарганізацыя, такім чынам, ганебна адстае на вучастку змаганьня за калектывізацыю сельскай гаспадаркі.

Райком КП(б)Б ня справіўся з правядзеньнем важнейшых палітычных кампаній. Сьведкамі гэтага зьяўляюцца таксама лічбы аб выніках веснавой сяўбы. Плян сяўбы па саўгасах і калгасах ня выканан.

проц.

Значна недавыканан плян па засеве асобных культур і асабліва тэхнічных.

Надзвычай марудныемі тэмпамі разгортваюцца мерапрыемствы па жывёлагадоўлі. Пад пагрозай зрыву знаходзіцца справа сіласаваньня. Зусім незадавальняюча праходзіць мабілізацыя сродкаў.

Рабочыя масы БССР рапартуюць аб перавыкананьні кантрольных лічбаў па рэалізацыі пазыкі. У гэты-ж час гор. Бабруйск дае толькі 92-93 проц. Яшчэ горш разгортваецца рэалізацыя пазыкі ў вёсцы.

Прарывы па радзе вучасткаў работы, у паласе якіх доўгі час знаходзіцца Бабруйскі раён, прымусілі ЦК КП(б)Б заняцца вывучэньнем кароньняў гэтых прарываў. ЦК КП(б)Б лічыць, што Бабруйская арганізацыя, якая налічвае ў сваім складзе 80 проц. рабочых і 60 проц. непасрэдна з вытворчасьці, бязумоўна, здаровая, адольная па-бальшавіцку змагацца за генэральную лінію партыі.

Дзе-ж прычыны прарываў? Гэта пытаньне ЦК КП(б)Б ставіць у першую чаргу актыву. На асноне разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі, актыў павінен даць на гэтым пытаньні вычарпальны адказ.

ЦК КП(б)Б лічыць, што асноўная прычына прарываў заключаецца ў тым, што арганізацыя не перабудавала сваёй работы па-новаму.

Замест узначаленьня ініцыятывы і актыўнасьці мас, такія арганізацыі і ўстановы, як зямельныя, каапэрацыйныя, прафсаюзныя і цэлы рад партыйных ячэек прапавалі па-старынцы, спадзяваліся на самацёк.

Райком КП(б)Б ня справіўся з тымі задачамі, якія перад ім стаялі. Ён не перабудаваўся па-новаму. У сваім кіраўніцтве РК ня быў апэрацыйным. Ён выносіў шмат пастаноў, і ніколі не правяраў іх выкананьня. Гэта відаць хоць-бы па рабоце камбінату, якому райком не аддаваў выключнай увагі.

Цяпер так кіраваць нельга.

Аднэй з прычын прарываў зьяўляецца тая абязьлічка, бездапазнасьць, якая існуе ў радзе ўстаноў і арганізацый. Гэта выяўляецца ў імкненьні цэлага раду кіраўнікоў нават у дробязных пытаньнях схавацца за плячыма райкому, скінуць з сябе адказнасьць.

У асобных зьвеньнях арганізацыі ў паяўнасьці нездаровыя зьявішчы і апартунізм.

На заводзе імя Сталіна кіраўнікі сустрэлі ў «штыхі» дырэктыву аб павялічэньні вытворчай праграмы. Аналёгічны факт меў месца на швэйнай фабрыцы. Замест узначаленьня актыўнасьці мас, якія лічылі магчымым выкананьне павялічанай праграмы, апартуністы з кіраўніцтва мікнуліся дэмабілізаваць рабочыя масы.

Масавая работа выпала з кругавіду вясковай партарганізацыі

Райком не правяў патрэбнай рашучасьці ў барацьбе з гэтымі нездаровымі настроямі і правямі апартунізму.

Вясковая арганізацыя яшчэ не падышла вічыльна да пытаньняў перабудовы работы па-новаму. Больш таго, цэлы рад калгасных парт'ячэек на працягу 4-5 месяцаў не праводзяць партсходаў.

У асяродзьдзі партыйнага актыву вёскі, як і гораду, ёсьць элементы бездапазнасьці. Асобныя таварышы стаяць у баку, не адчуваюць партыйнай адказнасьці за прарывы. Аб гэтым гаворыць хаця-б такія факты: з 56 сакратароў парт'ячэек на нараду зьявілася 18. З 70 чал., мабілізаваных райкомам для работы, у вёску зьявілася 6 чалавек.

Вясковая партарганізацыя ў твары яе асобных ячэек недастаткова рашуча змагалася з правым і «леным» апартунізмамі.

— У мяне, — гаворыць тав. Гантман, — няма дастаткова поўных матар'ялаў аб «левых» загібах, але некаторыя факты прыкоўваюць да сябе ўвагу. У асобных сельсаветах, напрыклад, «раскулачаныя» сераднякі да гэтага часу не адноўлены.

Слабасьць калгаснага руху тлумачыцца ў вялікай меры тым, што ў вёсцы няма добра наладжанай палітычна-масавай работы з адзіначкамі бедняками і сераднякамі, няма работы з калгасным актывам.

На сёнешнім партактыве, трэба раз на заўсёды дабіцца разуменьня таго, што ня толькі райком, але ўвесь актыў і кожны актывіст адказвае за прарывы, кожны камуніст павінен хварэць за работу.

Выходзячы з агульнага становішча работы ў Бабруйскай арганізацыі ЦК КП(б)Б лічыць неабходным узмацніць партыйнае кіраўніцтва раёну. У Бабруйск для адказнай работы ўжо накіравана рад таварышоў.

Новае ўзмоцненае кіраўніцтва, апіраючыся на вялікі актыў і здаровую, у асноўным, арганізацыю, павінна ў бліжайшы час дабіцца ліквідацыі прарываў у прамысловасьці, вырваўшы фронт калектывізацыі.

Трэба зьняць з кіруючай работы апартуністаў, якія ня хочуць адказваць за работу і паставіць лепшых бальшавікоў.

У заключнай частцы свайго дакладу тав. Гантман падрабязна спыняецца на тых канкрэтных задачах прамысловага і калгаснага будаўніцтва, якія стаяць перад Бабруйскай партыйнай арганізацыяй.

* * *

Пасьля прослуханага з вялікай увагай дакладу тав. Гантмана, шырока разгарнуліся спрэчкі.

Самакрытыка ня была мэтадам штодзённай работы

Тав. Рабкін (сакратар парткому камбінату) завастрыў увагу партактыву на прычынах прарываў на камбінаце.

Кожны дзень работы камбінату з прарывам абыходзіцца дзяржаве ў тысячы рублёў запазычанасьці. Асноўная прычына недавыканаўня пляну заключаецца ў тым, што кіраўніцтва парткому ня ведала, што робіцца ў цэхах. Яго работа зводзілася да вынясеньня агульных рэзалюцый, якія нікім ня выконваліся і не правяраліся.

Ня ўсё добра на камбінаце і з разгортваньнем самакрытыкі. У пасьцен-газэце зьявілася заметка, якая крытыкавала сакратара парт'ячэйкі фанэрнага цэху. Загадам прадстаўніка парткому гэта заметка была зьнята. Гэты факт кідае прамень сьвятла на агульнае становішча разгортваньня самакрытыкі ў арганізацыі. І сапраўды, калі-б у арганізацыі, як сьлед была разгорнута самакрытыка, актыў да гэтага часу не маўчаў-бы аб прарывах.

Для таго, каб па-сапраўднаму ўзяцца за ліквідацыю прарываў, трэба па-бальшавіцку разгарнуць самакрытыку, зрабіць яе мэтадам штодзённай работы.

Тав. Галавачоў, далкам згаджаючыся з ацэнкай работы партарганізацыі, якая дана ЦК КП(б)Б, падкрэсьліў, што адна з прычын прарываў — слабасьць разгортваньня самакрытыкі. Гэта ў першую чаргу адносіцца да актыву, які ня менш, чым райком, адказвае за прарывы. Выпадкі недысцыплінаванасьці, выкручваньне зд работы нярэдка праходзяць без належнага рэагаваньня. У гэтых адносінах варта павучыцца ў армейскай арганізацыі.

Тав. Рашкес (Райгандаль), гаворачы аб рабоце каапэрацыі імкнецца дрэнную падрыхтоўку да збожжазагатовак вытлумачыць адсутнасьцю і слабасьцю паасобных работнікаў. «Няма сакратара парт'ячэйкі, слаба працуюць прафсаюзы. Зразумела, (?) што са збожжазагатоўкамі мы спозьнімся».

Гэта заява, характарызуючая сваяасаблівую прывычку да прарываў, атрымала рашучы адпор з боку пазьней выступаўшых таварышоў.

Тав. Астолкэр далкам згодзен з ацэнкай работы бабруйскай партарганізацыі, якая дана Цэнтральным Камітэтам КП(б)Б. Прызнаючы віну райкому і сваю, тав. Астолкэр падкрэсьлівае, што прарывы, якія ёсьць у рабоце партарганізацыі, не скрываліся.

Прамова тав. Астолкэра была ў асноўным самакрытычная. Ён не без падстаў скардзіўся на недастатковасьць партыйных кадраў. Аднак, тав. Астолкэр не правы ў тым, што мабілізацыя 80 камуністаў (па працягу году) з Бабруйскага раёну для работы ў вёсцы садзейнічала стварэньню прарываў.

Бабруйская арганізацыя мае ўсе магчымасьці, каб даць больш чым 80 камуністаў-работнікаў для вёскі. Гэта ні ў якай ступені ня можа зьменшыць віны райкому і яе былых кіраўнікоў за прарывы.

Пастановы выносіліся, ня выконваліся і не правяраліся

У партыйнай арганізацыі Бабруйскага раёну, — гаворыць тав. Эльман, — недадаценьваецца пытаньне культурнага будаўніцтва. Сакратары ячэек не зьявіліся на нараду, якая была склікана райкомам па пытаньні падрыхтоўкі да навучальнага году. У ячэйках панае думка, што раз ёсьць дакрат аб усеагульным абавязковым навучаньні, дык ніякай растлумачальнай работы праводзіць ня трэба.

Асноўная прычына прарываў, — гаворыць тав. Гаварухін, — заключаецца ў тым, што райком КП(б)Б ня здолеў перабудаваць сваёй работы, актыў не разгарнуў бальшавіцкай самакрытыкі і гэтым самым не забясьпечыў выпраўленьня памылак кіраўніцтва.

— Бюро райкому, членам якога зьяўляюся я, ня здолела выбраць цэнтральных вузлавых пунктаў работы і па іх сканцэнтраваць увагу арганізацыі.

У гэтым сутнасьць памылак райкому.

Важнейшымі галінамі работы бабруйскай арганізацыі зьяўляецца пытаньне калектывізацыі і камбінат. Мы разьбіралі шмат пытаньняў, але калектывізацыі і камбінату не аддавалі выключнай увагі. Атрымлівалася так, што імкнна ў напрамку гэтых двух пунктаў ня было напорнага апэрацыйнага кіраўніцтва, а галоўнае—праверка выкананьня сваіх дырэктыў.

Партыйны актыў і кожны камуніст нарэшты да канца зразумець сутнасьць тых патрабаваньняў, якія прад'яўляюцца ЦК, і па-сапраўднаму ўзяцца за перабудову работы, за ліквідацыю прарываў.

Старшыня РКК РСІ тав. Міерын завастрыў увагу актыву на пытаньні масавай работы:

— Як у горадзе, так і ў вёсцы ў нас зусім слабая масавая работа. Гэта адна з прычын слабасьці тэмпаў калектывізацыі. Шэфства над калгасамі існуе толькі фармальна. Таксама фармальна ў нас лічацца 17 сацсуміяцыльнікаў, а іх працуе толькі адзін. З-за слабасьці масавай работы мы ня выканалі кантрольных лічбаў па рэалізацыі пазыкі.

Тав. Ляхэм падкрэсьлівае, што адказнасьць за прарывы ў значнай меры ўскладаецца на актыў.

За год па пытаньнях калектывізацыі ў раён пасылалася 500 чал. актыву. Зразумела, калі-б гэтыя таварышы працалі, як сьлед, ня было-б такіх прарываў.

— Мы ня вядзем ніякай работы па пытаньнях калектывізацыі з сезоньнікамі і рабочымі, якія зьвязаны з сельскай гаспадаркай. А між тым на камбінаце працуе 100 чал. з Падрэцкага сельсавету, які стаіць на апошнім месцы па калектывізацыі.

Сёнешні сход актыву павінен быць апошнім сходам, які гаворыць аб прарывах

**

У спрэчках выступалі т. т. Гершон (новы работнік РК), Байнэр (РК ЛКСМБ) Сіманоўскі (завод імя Сталіна), Хэсін, Зйдэльштэйн (камбінат) і Гольфанд.

Пасьля заключнай прамовы тав. Гантмана актыў прыняў рэзалюцыю, у якой цалкам далучаецца да ацэнкі работы бабруйскай арганізацыі, якую даў ЦК КП(б)Б.

Партыйны актыў абавязаўся ў самы кароткі тэрмін дабіцца ліквідацыі прарываў.

Бабруйская раённая партыйная арганізацыя мае ўсе магчымасьці для таго, каб крута ўзьняць тэмпы работы і сапраўды па-бальшавіцку змагацца за ажыцьцяўленьне баявых задач сацыялістычнага будаўніцтва.

В. Г—кі.

Даць па заслугах душыцелям самакрытыкі

На Капыльскім камбінаце, на працягу доўгага нарыду, панаваў рад злачынных непаразумкаў. Адміністрацыя ня ўжывала ніякіх мер для рацыяналізацыі вытворчасьці, нядбайна адносілася да рабочых прапаноў. Сярод рабочых ня было разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва. Адміністрацыя камбінату разбазарвала дзяржаўныя сродкі, займалася самазабесьпячэньнем. З камбінату выдана рабочым 1.200 пуд. вотрубей для кармленьня ўласнай жывёлы. Кіраўнік камбінату Шлейфэр, таксама трымаў жывёлу і карміў вотрубямі камбінату. Апрача гэтага многа разбазарана пшанічнай мукі. Так было да пачатку бягучага году. Потым, Шлейфэр быў выбран старшынёю РВК, а загадчыкам камбінату быў пакінуты яго бліжэйшы памочнік Гофман. Па прыкладу свайго папярэдніка, Гофман працягваў разбазарваць маемасьць камбінату. Разбазарваньне адбывалася ў той час, калі ў радзе калгасаў і саўгасаў вельмі востра стаяла пытаньне з кармамі.

Рабочыя ведалі аб фактах злоўжываньня з боку кіраўнікоў камбінату, аднак нідзе аб гэтым не гаварылі. Крытыка на камбінаце была прыдушана. Толькі са зьяўленьнем на камбінаце тав. Папова ўпяршыню быў падняты голас пратэсту супроць злачынстваў з боку кіраўнікоў камбінату. Тав. Папоў, у сувязі з пераборкай камбінатам некаторых рэчаў і прылад з недапушчальным павышэньнем сабекошту, выступіў супроць гэтых зьявішч і рэзка крытыкаваў работу мэханіка Рубінчыка.

Ячэйка КП(б)Б камбінату замест таго, каб стаць на чале самакрытыкі і ўзьняць яе на вышэйшую ступень, накіравала агонь не на недахопах, якія маюць месца на камбінаце, а супроць тав. Папова, які выступіў і адкрыта заявіў аб усіх непаразумках. Гэтым самым бюро ячэйкі амніставала тых, хто меў за сабой злачынствы, гэтым бюро ячэйкі паставіла сябе ў ролю глушыцеля самакрытыкі. Бюро ячэйкі свае няправільнай пастановай дало повад Рубінчыку, пры актыўным падтрыманьні Шлейфэра падаць заяву ў суд на тав. Папова. Сьледчыя органы, пасьля пакаваньняў Шлейфэра, аб тым, што на камбінаце няма ніякага шкодніцтва з боку кіраўнікоў, а ёсьць шкодніцтва з боку тых, хто крытыкуе, павяла сьледзтва па абвінавачаньні рабочага Папова ў паклёпах. Суд фактычна распачаў справу па абвінавачаньні тав. Папова ў... самакрытыцы.

Усе гэтыя акалічнасьці справы ўнесьлі ў рабочую масу настрой, што начальства крытыкаваць ні ў якім разе нельга.

Толькі пасьля ўмяшаньня вучасткавага пракурора тав. Каваленка, справа на тав. Папова была спынена і далучана да справы аб шкодніцтве на камбінаце.

Характэрна адзначыць і такі факт падсіджваньня тав. Папова. Тав. Папоў заўсёды выкрываў недахопы, якія былі на камбінаце, даводзіў аб іх да ведама РСІ, пісаў у газэту. Аднойчы, калі рэдакцыя газэты, напісала тав. Папову ліст, дык ён чамусьці папаў у канцылярыю камбінату і быў ускрыты бухгальтарам Абрамовічам.

Раённая КК-РСІ вылучыла камісію для абсьледваньня гэтай справы. І калі член камісіі тав. Нарэйка, на пасяджэньні прэзыдыуму КК-РСІ прачытаў свае вывады, дык Шлейфэр там-жа выступіў з недапушчальным абвінавачаньнем камісіі ў тым, што яе вывады зьяўляюцца паклёпам. Факты душаньня самакрытыкі камісіяй КК-РСІ былі ўстаноўлены. Але чамусьці прэзыдыум КК-РСІ вылучыў другую камісію для абсьледваньня камбінату. Другая камісія таксама пацьвердзіла заціск самакрытыкі з боку Шлейфэра.

Гэта справа першага жніўня разьбіралася на аб'яднаным пасяджэньні бюро РК і прэзыдыуму РКК. Пасяджэньне констатавала заціск самакрытыкі з боку Шлейфэра, а таксама констатавала і факты разбазарваньня маемасьці камбінату. Што-ж пасьля ўсяго гэтага павінна было зрабіць пасяджэньне?

Аб'яднанае пасяджэньне бюро РК і прэзыдыуму РКК павінна было бязьлітасна ўдарыць на грубым заціску самакрытыкі, павінна было Шлейфэра і іншых вінаватых гэтай ганебнай справы прыцягнуць да суровай адказнасьці. Аднак, справа стаяла інакш. На пасяджэньні была ўнесена прапанова даць Шлейфэру вымову і другая—паставіць на від (якое «суровае» спагнаньне (!!) І ў сувязі з тым, што на пасяджэньні галасы падзяліліся напалову—пароўну за кожную з гэтых дзьвёх прапаноў, справа была перанесена на чарговае пасяджэньне. Нам невядома як вырашана гэта справа ў другі раз. Але паводзіны членаў бюро РК і прэзыдыуму РКК у данай справе гаворыць аб тым, што Капыльскія кіраўнікі не разумеюць лёзунга партыі аб разгортваньні жорсткай пралетарскай крытыкі, не зважаючы на асобы. Між іншым нельга не паказаць і на такую дэталь. Кіраўнік раённай партарганізацыі — сакратар РК тав. Мурашкевіч, таксама быў за тое, каб Шлейфэру за грубы заціск самакрытыкі паставіць на від. Якое нераазумеьне важнейшага палітычнага лёзунгу партыі! Якія нягыбокія адносіны да сур'ёзнейшай справы! Рабочага актывіста і работніка, які выкрываў злачынствы, душыцелі самакрытыкі і бюракраты прымалі меры каб аддаць пад суд, а кіруючыя работнікі, дабрадушна да іх адносяцца.

Ці-ж будуць пасьля гэтага рабочыя масы крытыкаваць, ці будуць яны выкрываць усе тыя хварэйтыя зьявішчы, якія ёсьць у раёне?

А.

ДЗЬВЕ ЛІНІІ

ДЗЯМІД БОЙЧЫК

2. разгон

1.

На рагу кавальнага цэху вісіць вялікая фанэрная дошка і ўдоўж яе лягае стройная дарожка белых літар— «Зьвязда» штурмуе прарыў». Кожны дзень мы вывешваем на ёй новыя матар'ялы і каля штурмавой дошкі заўсёды новыя чытачы.

«Зьвязда» наклейваецца на ўсіх цэхавых «дошках для абвестак» і ўсе работы ведаюць пра нашу работу, усе рабочыя зьвязаны са «Зьвяздой».

Калі прыходзіць перапынак на сьнеданьне—людзі сыпяцца зрабіць дзьве работы: прачытаць новыя матар'ялы «Зьвязды» і пад'есьці.

— Косьцік!—на бягу крычыць чарнявая, маладая работніца у палаватай кашулі,—займі мне месца, а я прачытаю і табе раскажу.

І Косьцік, як пакстрелены, бяжыць у сталоўку, а дзяўчына ў майцы хуценька чытае выразкі са «Зьвязды».

...Абвесткі паведамляюць, што сход будзе ў садзе за вадакачкаю. У работы гарнітурах і няўмытыя ішлі людзі на сход заводскага актыву. Адны проста садзіліся на зялёную траву, другія на лаўчкі, а фізкультурнікі прымайстраваліся на штабелях дошак, каб і слухаць і загадваць.

Гаварылі аб заводзе і прарыве. Дакладваў дырэктар. Рабочыя выступалі жвыўна і горача. Ва ўсіх—адно жаданьне—выпрацаваць «маскітаў» і цалкам выконваць праграму.

Сход зацягваўся і ў сад прыбыў бурзт. Людзі, не парушаючы работы, бралі прэсавыя і кацяцкіну, ды зьяўтаваліся на свае месцы. Закусвалі, гаварылі і слухалі.

Слова ўзяў дэмабілізаваны камандзір палка, слухач курсаў чырвоных дырэктароў. Ён почаў сваю прамову ўзьвышана і выразна, нібы гаварыў не перад цэлым чырвонаармейцам палкам, прыгатаваным да бою. Учарашні камандзір, з вышэйшай баявой узнагародай за вайсковыя фронты, і зацяжны чырвоны дырэктар заклікаў людзям НЕ АДСТУПАЦЬ.

— На нашым заводзе мы ўсё адступаем, плыбей адыходзім у тыл! А пасобныя частві адыходзім без бою. Куды гэта варта?! Мы ня можам болей адступаць! Нам ніхто ня даў такога права. Мы абавязаны сёньня-ж, на гэтым нашым баявым сходзе, абавязацца па ўсім заводзе трывогу, замацаваць пазыцыі і заўтра-ж разгарнуць наступленьне.

Брыгадзір «Зьвязды» біў фактамі і ставіў задачы. Ударнік Ляпідус, сівенькі і малы, але энэргічны, як ток, выступіў у абарону забытай сячкарні і бульбамыйкі.

— Для таго, каб гэтыя машыны выкарыстаць мудрагна,—гаварыць Ляпідус,—нам трэба зрабіць яшчэ адну новую машыну

—ГАЛАВАМЫЙКУ... Шмат каго з нашых работнікаў неабходна прапусьціць праз такую машынку...

Пастанова казала, што больш адступаць ні ў якім разе нельга, што трэба замацаваць пазыцыі і ўзяць дыстанцыю для разгону, каб цалкам выконваць праграму.

Разгон пачаўся з аб'яднанай вытворчай нарады зборачнага і мэханічнага цэхаў. Нарада была склікана на настойлівым патрабаваньні брыгады «Зьвязды» і зьбіралася ўзорам дзелавітасьці і канкрэтнасьці ў барацьбе з міжцэхавымі непаладкамі.

У зборнічыкаў набралося шмат злосьці на мэханікаў і яны хацелі паказаць апошнім, дзе «раки зімуюць». Нават першыя выступленьні паказалі высокую ступень незадавальненасьці людзей і сакратар партколектыву гэту незадавальненасьць пастараўся сваячасова разрадзіць, накіраваць яе ў патрэбнае рэчышча.

Пачалі гаварыць проста прапановамі. Выступаў рабочы і выносіў сваю прапанову. Яе абмяркоўвалі і прымалі, або адкідалі. Потым пераходзілі да другой прапановы, да трэцяй, чацьвертай...

Першая аб'яднаная вытворчая нарада выпрацавала баявую праграму для работы самага культурнага цэху—мэханічнага. Усе астатнія цэхі выйшлі на спаборніцтва і вытворчая нарада вызначыла для іх дыстанцыю» разгону.

2.

Пасьля шабашу кацельшчыкі ломаным кругам разьмясьціліся на дошках, за плячыма свайго цэху. Камсамолец у парчавой цюбяцейцы,—лепшы брыгадзір маладзёжнай брыгады, чытаў Сталінскую прамову. Камсамолец стараўна выточваў кожнае слова, на асабліва важных сказах стрымліваўся і прачытваў на другім разе. Яго голас і рухі сталі такімі, нібы ён сам гаварыў прамову...

Кацельшчыкі слухалі ўважліва і нахружана, баяўся прапусьціць слова і яно не пралятала міма іх успрыманьня.

Чыталі кожную задачу ў паасобку. І калі камсамолец узвышаным голасам і з асаблівым націскам прачытваў «...ліквідаваць цяжучасьць рабочай сілы, зьні шчыць уражінпаўку, правільна арганізаваць зарплату, палепшыць бытавыя ўмовы рабочых—такава задачы...» за некаторы час наступала маўчаньне, а потым кацельшчыкі выступалі і сталінскім словам прызяралі свой завод.

У першыню выступіў самы стары рабочы, з самым вялікім на заводзе вывэрочным станкам, ударнік тав. Матусаў. Стары гаварыў узвышана і энэргічна, як толькі мог, і ўсё-ж ён ня выказаў усяго таго ўздыму, які ўліла ў яго сталінская прамова. Ён гаварыў бадзёра і радасна нібы юнак і адчуваў ся бе ўсім-ўсім маладым.

Тав. Крупскі, ударнік брыгады па сячкарнях, ня выступіў на прапрацоўцы, прамовы т. Сталіна, бо баіўся, што нясьцэвавы выйдзе.—«Ня ўмею гаварыць на сходах». І яго гэта мучыла ўсю ноч, і ня мог ён заснуць.

А на заўтра....., на зьмятых лістках, перадаў майстру 18 прапаноў, вельмі цікавых і каштоўных, рацыяналізатарскіх прапаноў.

Сталінская прамова зьявілася для заводу вагаром, які вывёў Гомсельмаш з мёртвай стаянкі. Хваля творчага энтузіязму, выкліканая прамовай, ня была хваляй, якая прыбівае і адыходзіць назад. Гэта быў непарэўны струмень току, электраэнэргіі з гіганцкай станцыі і людзі ад яго рабіліся больш дужымі і ўпартымі.

3.

Пакойчык партыйнага калектыву маленькі і цесны. Стаіць два чорных сталы. Адзін—для сакратара калектыву, а другі стол падзелен на дзьве роўныя часткі: палову партыйнаму АПА і палову—камсамольскаму сакратару.

Ні адны дзьверы на заводзе не адчыняюцца так часта, як дзьверы гэтага маленькага пакойчыка. Сюды людзі ідуць і па адным і цэлымі брыгадамі. У пайкочык набіваецца, як у трамвай, і сады дзьвярэй нельга зачыніць.

Генкін, сакратар партыйнага калектыву, толькі што прышоў з гораду, з пасяджэньня бюро гаркому, і яго цяпер абкружаюць шчыльным кругам. Генкін выбірае хуткай успацелы лоб і вітаецца з людзьмі.

Дрыц,—начальнік мэханічнага цэху—прыехаў з камандыроўкі і дакладвае Генкіну пра зробленае. Ён сяча пырокаю рукою па рагу стала і нешта даводзіць сакратару, абераеце сваю дакладу. Генкін слухае, коратка запісвае на лістку перакідного каляндара і спакойна кажа Дрыцу:

— Ідзі цяпер у цэх і націскай, а пасьля работы зойдзеш і дагаворыся.

Дрыц больш не пасьпеў нічога сказаць, бо з Генкіным ужо гавораць новыя людзі—пра партыйную работу, пра сьвяздзы і вараштаты, пра прамфінплян і заклёпкі, карткі ўдарніка і кватэры, гаспадарчы разрахунак і кормы...

Праз тры хвіліны кампанцыя перапынак. Генкін хоча бачыць па гадзіннику, пертым прабіраецца да дзьвярэй і выходзіць з партколектыву. Ад яго не адстаюць тыя, хто яшчэ не гаварыў, хто не абмяркоў дырэктыў, ці аддалу. Выходзяць утрох і як ідуць на заводзкі двор, у цэхі. Ідуць і гавораць, дагаварваюцца і ўгадваюць.

...І сёньня дзень пачаўся бокам. Ад самага ранку праробка судрыгальная хвеля па кавальным і зборачным. У габінеце дырэктара і ў канторках, у рэдакцыі шматгаразкі і на складах гавораць пра заклёпкі. І колькі крыві людзям пакасала гэта маленькая чорная заклёпачка?!

Яе на заводзкіх складах няма. «Прашлялі»! Не пакланаліся ўчора, не праверылі, і сёньня бегаюць у мітусьні.

Вінавата Міхайлаў—загадчык аддзелу забесьпячэньня. Ён адчувае, як злосна глядзяць на яго сотні рабочых вачэй і ня ходаць, а бегае па заводзе. Міхайлаў хуценька-хуценька крэціць тэлефонную ручку і настойліва просіць цэнтральную хуткай дазаць выкліканыя нумары. Міхайлаў звоніць на завод ім. Ланцюцкага, на «Пралетары» і «Рухавіх Рэзаноўцы», ды вымальвае хоць некалькі кілёграмаў заклёпак.

— Ратуйце,—крычыць у тэлефонную трубку Міхайлаў.—Правал. Стаім!

Генкін, у балетках на босую нагу і ў рэпфронтаўскай зялёнай гімнасьцёрцы, ідзе проста да клапальшчыкаў. Яны бачаць яго і весялеюць.

Прыёмшчык даводзіць клапальшчыкам. Ён моцна гаворыць нібы на шматлюдным сходзе і кожнае сваё слова падмацоўвае прыстукам малаточку па рабочым стале.

— Ды зразумейце-ж вы што нельга... кажа прыёмшчык.—Не магу я прыняць такія калёсы, з пункту гледжаньня вытворчасьці... Заклёпка тонкая?—Тонкая. Можа сесьці?—Можа. А калі сядзе—значыць і парвецца. Вось вам простая рабочая арытмэтыка... І не магу-ж я прыняць такія калёсы, з пункту гледжаньня вытворчасьці...

Сакратар партыйнага калектыву становіцца на месца клапальшчыка, сплюнуўшы на рукі бярэ малаток і кажа другому клапальшчыку:

— Вельмі, Пятро, паклапаем...

Усе змоўклі, абкружылі назвычайную пару клапальшчыкаў і сочаць.

Ёмка ўзьнімаюцца малаткі ўверх, пагойдана адпускаюцца ўніз і адна, другая, трэцяя... заклёпка моцна-моцна прыцітвае сьпіцу да вобада.

Тады Генкін кажа:

— А цяпер дайце зубіла... Выб'ем заклёпкі назад.

Выбіваюць заклёпку адну, другую, трэцюю. Сакратар бярэ іх на далонь, паказвае прыёмшчыку і ўсім клапальшчыкам.

Усе зьбітыя назад заклёпкі ня маюць ніякіх сьлядоў асяданьня. Выходзіць, што яны ня будуць сядзіцца і ня будуць рвацца. Дык чаго-ж крычаць і хвалявацца?

Вінавата глядзяць клапальшчыкі і прыёмшчыкі на сакратара і дакараюць сябе—чаму самі не дагаварыліся да такой простай рэчы і не праверылі заклёпак.

Генкін ведае і добра разумее гэтых рабочых. Ён хоча стрымаць сваю ўзьмыку, але яму гэта ня ўдаецца і так мякка гаворыць:

— Думаць трэба, хлопцы... Бяз гэтага цяжка. Вось вы стаіце і крычыце. Што толку? Заклёпкі, якіх у нас ёсьць вялікі запас, крыху таньнейшыя за тыя, што вы ўчора клялі. Розьніца нікчемная і зусім ня зьяўляе якасьці. Вы самі пераканаліся, што яны не садзяцца і рвацца ня будуць... Трэба-ж думаць, хлопцы, шавяліць мазгамі.

Клапальшчыкі агаджаюцца ляюць на рукі і дружна бярэцца за цяўё малаткоў. Яны сёньня адсталі і зараз будуць наганяць упушчанае.

Генкін з кавальнага ідзе ў мэханічны, ліцейны і там кіруе канкрэтна, прадметна... Уваходзіць у тэхніку справы, уваходзіць у дэталі справы, удумляецца ў «дробязі», бо з «дробязей» будуюцца цяпер вялікія справы.

У сакратара сельмашэўскага партколектыву пічасьлівае злучэньне— ён вопытны партыйны работнік і высококваліфікаваны рабочы.

Анатоль Генкін ведае ўсе машыны на заводзе. Больш складныя ўстанаўліваліся яго рукамі і ён адлёк, па гуду, распазнае іх здароўе. У мэханічным ён праязджаць між машын, заглядае ў іх «душы», правярае падшыпнікі, асабліва ўважлі

Будаўніцтва Дому Друку ў Гомелі. На здымку: Механізаваная падача цэгры.

НАСУСТРАЧ НАВУЧАЛЬНАМУ ГОДУ

ПАЧАЦЬ ЗАНЯТКІ 1 верасьня

НІ АДНАГО ДНЯ СПАЗЬНЕНЬНЯ

ТОЛЬКІ 9 ШКОЛ АДРАМАНТАВАНА З 37...

ПУХАВІЧЫ, 21. (Белта). У ПУХАВІЦКІМ РАЕНЕ школьнае будаўніцтва пракоп'яіць вельмі марудным тэмпамі. З 37 школ рамонт закончан толькі ў 9, у дасёбх яшчэ зусім не распачата работа па рамонце. Рамонт школ выкананы на 35-50 проц.

Паводле пляну трэба было ўжо пабудаваць 4 новыя школы, але будаўніцтва толькі яшчэ распачата. У мястэчку ПУХАВІЧЫ школа будуецца з 1921 году. Будаўнічым матар'ялам поўнасьцю забясьпечана, але будаўніцтва не закончана і матар'ял гніе. Нарэшце пабудаваны, але яшчэ і цяпер стаіць без даху. Работнікі сельсавету не клапоцяцца, каб хутчэй накрыць дом, а чакаюць цыкну, таварышы: «лепш 1-2 гады пачакай пабудуе без даху, але затое зробім дах з цынку».

Такое-ж становішча і ў ПАРЭЧСКІМ сельсавеце. Там таксама школа будуецца з 1921 году і да сёньняшняга дня не закончана.

Усе гэтыя факты сьведчаць, што раённыя прыкаўнікі апартуністычна адносяцца да будаўніцтва школ.

МЕНСКІ ГАРІНА НЕ КЛАПОЦІЦЦА...

МЕНСК, 22. (БЕЛТА). Падрыхтоўка да навучальнага году на Менскім раёне прапануе надзвычай марудныя тэмпы. Гарына зусім мала клапоціцца аб своечасовай падрыхтоўцы да новага навучальнага году.

Рамонт школ яшчэ не скончан. У Народычах, Сеньніцы, Ратмяцуны і Падгайскай школы — без даху. Не хапае кнігаў і зошытаў. Два месяцы таму назад Наркамправу было заказана 4 вагоны кнігаў, але да гэтага часу яна не дастаўлена.

Есьць загроза, што ў памянёных сельсаветах навучальны год пачнецца пазьней 1-га верасьня, калі ня будуць прыпасаваны старыя памяшканьні.

З абсталяваньнем школ справа дрэнная. Не хапае школьнай мэблі, і да 1-га кастрычніка новай ня будзе зроблена. Школы зусім не забясьпечаны гаротным сьняданьнем. Белхадсаюз і МІРК нічога ня робяць у гэтых адносінах, вядомы, што гэта справа мясцовых арганізацый і фондаў.

Наладжаньнем корачых сьнеданьняў шляхам запікаўшча калясы — мабілізаваць калгасныя рэсурсы на гарачае сьнеданьне.

ГорНА трэба прыняць усе меры да ліквідацыі прарываў і не дапусьціць ні аднаго дня зрыву школьных санітараў.

БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦЬ У СЕМЕЖАЎСКАЙ ШКМ

ЧЫРВОНАЯ-СЛАБАДА. У семежаўскай ШКМ ніякай падрыхтоўкі да новага навучальнага году не вядзецца. У школе пануе поўная безгаспадарчасьць. Вокны ўсе паразьбіваны, сьцены і школьныя пакоі не панову разбураны. Школьны паказальны вучастак зарослы зарослямі. Не ім пасецца жывёла, загадчык ШКМ НОВІК нічога ня робіць.

Патрабуем прыняцьця рашучых мер у адносінах да НОВІКА і адпаведнага выгляду семежаўскай ШКМ.

Вучні.

На заводзе „Чырвоны адраджэнец" ліквідацыя непісьменнасьці не разгорнута

МАГІЛЁЎ. У механічным і ліцейным цэхах заводу «Чырвоны адраджэнец» з яго 800 рабочых ніхто ня ўсім ліквідацыяй. Вафком, партыйная і камсамольская арганізацыі ня прымаюць ніякіх мер для навучаньня непісьменных рабочых, ня цікавяцца на тое, што гэтай непісьменнасьці больш вялікае жаданьне вучыцца грамадзе.

Масакоў.

БАРАЦЬБА ЗА СІЛАС

„ПРЫКЛАД" ПАКАЗВАЕ дрэнны прыклад

БЕЛЬСК. Жывёлагадоўчы калгас «Прыклад», пасьлянёны засілаваньнем 115 тон зялёнай масы. Але абласныя ямы ніяк не гатовы. Адпушчаны ўжэсны г. г. сланечнік для засеву пад сілас не скарыстаны на сваім прызначэньні, а разданы калгаснікам.

Казінцоў.

ЗМАГАРЫ ЗА СІЛАС

Засілаваў 150 тон

ПЛЕШЧАНІЦЫ. У мінулым годзе калгас «ЧЫРВОНЫ ШТАНДАР» засілаваў 100 тон зялёнай масы. Сілас удаўся вельмі добры. Калгаснікі зразумелі ўсю карысьць сіласу і ў гэтым годзе узяліся па-бальшавіцку за сілаваньне.

Паводле пляну калгас павінен засілаваць 250 тон, калгаснікі-ж высунулі сустрэчны план У 300 ТОН. План ужо выконваецца з посьпехам. На 15 жніўня ўжо засілавана 150 тон.

Прыклад калгасу «Чырвоны штандар» — ва ўсе калгасы БССР!

Брыгадзір «Зьвязды» М. САКАЛОЎСКІ.



Жывёлагадоўлі — кармавую базу. Сіласная вежа у калгасе.

6 сельсаветаў — не засілаваралі ні аднэй тоны

ЛЕПЕЛЬ. (Наш. кар.). На 20-та жніўня ў Лепельскім раёне плян сілаваньня выкананы усяго на 9,1 проц. Ня толькі калгасныя калгасы, але і цэлыя сельсаветы аб сілаваньні нават і ня думаюць. 6 сельсаветаў: Заціхінскі, Пляпяноні, Вапосеўскі, Восяцкі, Сушанскі, Замоскі — не засілавалі ні адной тоны.

Трэба пакласьці канец імправізацыі сіласу. На працягу ўдарнага дэкадніка прарыў павінен быць ліквідаваны.

КАРМЫ ГІНУЦЬ

ГЛУСК. На Загальскім масыве ў Глускім раёне дагэтуль яшчэ не пачаў касіць 4.000 гэктараў сенажаці.

Толькі 14-та жніўня пленум глускага РК КП(б)Б прыняў пастанову аб тым, каб паслаць брыгады для ўборкі гэтай сенажаці.

Па вестках райвалтасаяу ў радзе калгасаў ня скошана па 5-10 гэктараў сенажаці.

Раённыя арганізацыі не ўзяліся на-бавому за ўборку сенажаці. Мы патрабуем прыцягненьня да суровай адказнасьці винаватых у тым, што 4.000 гэктараў застаюцца ня скошанымі.

Упаўнаважаны ЦК КП(б)Б КОКАНАЎ.

ПАЗЫКА „ТРЭЦІ РАШАЮЧЫ"

АХАПІЦЬ ПАЗЫКАЙ усіх працоўных!

З ПОСЬПЕХАМ ЗАВЕРШЫМ РЭАЛІЗАЦЫЮ НА ВЁСЦЫ

Рэалізацыя пазыкі па БССР (у проц.)

На 5 жніўня	На 10 жніўня	На 15 жніўня
60,3	88,7	90,1

ПРОМІЙ УДАРНІКАМ ПАДПІСКІ

Калегія Наркамфіну БССР адзначыла, што ГАЗЭТА «КАЛГАСНІК БЕЛАРУСІ» правяла здавальняючую работу па рэалізацыі пазыкі на вёсцы. У распарадженьне рэдакцыі газэты выпучана 1.000 руб. для прамійваньня лепшых селькораў-ударнікаў падпіскі.

Апрача таго, брыгада калгаснікаў Беларусі, якая працавала ў Жлобінскім раёне па рэалізацыі падпіскі, у складзе 5 асоб прамійвана па 75 руб. на кожнага з чал.

***

ЦЕРАХАЎКА. За пакінае праведзеньне рэалізацыі пазыкі ў адзінаасобным сэктары райвыканкомам прамійваны тры сельсаветы: ГРАБОЎСКІ сельсавет — у 200 руб., ДЕНІСКІ — 150 руб. і ПАДАБРАСКІ — 120 рублёў. Адстаючыя сельсаветы павінны ўзяць прыклад з перадавых.

ЛІСТ З БЭРЛІНУ

ЯК ГЭТА было

„Рукі з кішэняў!"

Бюлаў-пляц, плошча Бюлова ляжыць у цэнтры Бэрліна ў некалькіх сот мэтраў ад важнейшага цэнтру Бэрліна. Аляксандр-пляц, пляц вядомы тым, што на ім знаходзіцца бэрлінскі паліцэйпрэзыдыум, панаваньне сацыял-фашыста, Гржэзінскага. Паміж гэтымі двума плацамі—паліцэйская казарма. На першым пляцу—будынак ЦК кампартыі Нямеччыны. На плошчах красуецца туземнае хацінак, у якіх жывуць рабочыя і самаружкі і некалькі дамоў больш прыгожых, заселеных сярэднімі коламі працоўных.

9 жніўня, у дзень рэвалюцыйнага народнага галасаваньня, усе вуліцы вакол дому ЦК кампартыі, ці як яго называюць у Бэрліне, «Карл Лібкнехт-Хаўза» сабраліся групы рабочых. Над домам развіваўся чырвоны сьцяг. Фасад дому быў упрыгожан лёзунгамі, якія заклікалі бэрлінскіх рабочых да сумеснай барацьбы за Чырвоную прусію. Беспрацоўныя і рабочыя ўсё ў вялікай колькасьці падыходзілі да дому, чакаючы, што скажуць ім кіраўнікі.

Але на ўсіх вуглах вуліц, галоўным чынам супроць дому ЦК, гуртаваліся ў сваіх вялікіх аўтамабілях і паліцэйскія. Па тры, па чатыры яны разгульвалі па тратуары, разганяючы рабочых. — «Разыходзіцца, разыходзіцца, не супыняцца тут»—крычалі яны на дрэнна апранутых рабочых.

— «Калі ласка, праходзьце далей», мягка аварачаліся яны да лепш апранутых рабочых. Гэта працягвалася да позьняга вечара. Вакол дому ЦК зьбіралася ўсё большая колькасьць рабочых. З наступленьнем вечара зьявіліся апошнія сілы паліцэйскай ветлівасьці. «Ці пойдзеце вы, нарэшце, адсюль?» Рабочыя маўклівымі групамі пераходзілі на другое месца, не пакідаючы пляц.

Усё больш і больш аўтамабіляў. Усё часьцей і часьцей прарэзваюць паветра гумовыя палкі. Раздаюцца крыкі жанчын. Рабочыя мітусяцца на пляцы. Раптам пачуліся два выстралы.

Гэта здарылася дзесьці каля кіно, рэклямныя агні якога ярка асьвятлялі вуліцу. Яшчэ два выстрелы. Сярод тых, што сабраліся на пляцы, вялікі рух. Людзі кідаюцца над абарону дамоў. Новыя выстралы яшчэ і яшчэ...

«Рукі ўверх... Рукі з кішэняў. Разыходзься»,—крычаць паліцэйскія. У пярэдняй кіно два забітых паліцэйскіх афіцэры. У пяць хвілін пляц апустэлы. На кожнага выпадковага праходзьня накіроўваецца пражэктар. З рэвальвэрамі ў руках паліцэйскія накідваюцца літаральна на кожнага прахожага, выкрыкваючы «хант» (стой, «рукі ўверх...» Выстралы чутны з усіх бакоў. Пад пражэктарам жывуць акрываўлены рабочы. На пляцы імчацца аўтамабілі з паліцэйскімі. Вокны агаляючых хацінак заліты асьляпляючым сьвятлом пражэктараў. «Зачыніць вокны... не стаяць ля вокнаў»,—чутны крыкі паліцэйскіх. Зноў выстралы. Дзесяткі паліцэйскіх заняли пляц Бюлова. Крыкі «стой, ні з месца». Новыя грузавікі. Выстралы. Зноў грузавікі. Зноў выстралы. Будынак ЦК акружан паліцыяй. Перад уваходам у будынак — чатыры грузавікі з паліцэйскімі. З будынку забаронен выхад. Нікому ў будынак не дазволена ўваходзіць. Зноў выстралы. У доме ЦК чутны гук пабітага шкла. У вокнах ніводнага агня. Паліцыя ўрываецца ў дом, арыштоўваючы рабочых.

З шумам падкатвае новы грузавік з паліцэйскімі... Огё... ужо вінтоўкі. Паліцэйскія яўна нервуюцца. Вінтоўкі напагатове. Выпадковы выстрал. Сярод паліцэйскіх паніка.

Побач з будынкам ЦК памяшканьне... «музычнай залі». Там некалькі сотень рабочых, яны чакаюць адкрыцьця сходу, на якім кампартыя паведаміць результаты рэвалюцыйнага народнага галасаваньня. Раптам заблішчалі каскі паліцэйскіх. «Ачысьціць залю»,—крычыць лейтэнант. Рабочыя вагаюцца. Затрымелі гумовыя палкі. На пляцы Бюлова ўсё яшчэ чутны выстралы.

Да гадзіны ночы працягвалася гэта вайна тысячы паліцэйскіх з пустымі вокнамі і пустымі вуліцамі. Паступова паліцэйскія аўтамабілі накідаюць пляц. У пыліты хуткай дапамогі да раніцы 9 жніўня было дастаўлена 16 рабочых, з іх адзін забіты і 15 цяжка параненых. За знаходжаньне забойцаў паліцэйскіх афіцэраў Аплаўфа і Лінка сацыял-фашыст Гржэзінскі абяцае 3 тыс. марак узнагароды.

Г. Андрыс.

Бэрнард Шоу адказвае сваім „крытыкам"

ЛЁНДАН, 20. Бэрнард Шоу ў лісьце ў рэдакцыю «Таймса» адказвае сваім крытыкам, якія цьвердзяць, што камунізм зьяўляецца адмаўленьнем дэмакратыі, індывідуальнай свабоды і г. д. Шоу ўказвае, што савецкая сыстэма па сутнасьці непараўнальна больш дэмакратычна, чым ангельская сыстэма.

Шоу заяўляе, што свабода ў СССР не азначае свабоду гультаяваць і эксплёатаваць. «Палітычны апарат, — працягвае Шоу, — там пабудаваны для перадачы 1 дзелавога выкарыстаньня і ўладае выстарчальнай магчымасьцю, каб абяспечыць людзей, якія ўстаюць палкі ў калёсы. Карацей кажучы, гэты апарат больш дэмакратычны, чым парлямант і палітычныя партыі.

Закранаючы далей пытаньне аб «свабодзе слова», Шоу ўказвае, што свабода слова азначае магчымасьць для нармальных людзей газарыць тое, што яны хочуць і не цярпець ад прымусовай двуцішасьці. Паводле слоў Шоу, сьмешна цьвердзіць, што ангельскія рабочыя карыстаюцца такой свабодай. «Магчымасьць свабодна выказваць свае думкі над пагрозай страціць заработак» наўрад ці варта таго, каб пацірацъ за гэта».

У заключэньне Шоу ўказвае, што толькі людзі такіх перакананьняў, як Чэрчыль, могуць думаць, што рускіх прымушаюць маўчаць, «каб перашкодзіць ім патрабаваць вызваленьня ід да стаку, у якім знаходзіцца насельніцтва гэтай выспы, пасе зацыгуласі ў вельмі забытным становішчы».

(Бэрнард Шоу мае на ўвазе Вялікабрытанію).

БАБРУЙСКІЯ БУДАЎНІКІ

ПАБІЛІ ўсесаюзны рэкорд

ПА СКЛАДАНЬНІ СТАНДАРТНЫХ ДАМОЎ

20 гадзін

замест трох тыдняў

БАБРУЙСК.

18-га жніўня рабочыя-будаўнікі пад кіраўніцтвам лепшага тэхніка-ўдарніка КІЛЬЧЭЎСКАГА склалі стандартны дом на працягу 20 гадзін у той час, калі звычайна на гэту работу траціліся тры тыдні. Дом сыстэмы таз. КІЛЬЧЭЎСКАГА.

У брыгадзе будаўнікоў працавала 25 чал. Асабліва ўдарныя тэмпы паказалі т. т. ГУКАСАЎ, АРЛОЎ, ЛАПЕКА, СІНІЦКІ, БЯГА, БАБКОЎ, РАДКЕВІЧ, УСТРЭЙКА І КАШЭЛЬ.

С. КАГАН.

ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКІ

РАУНЕНЬНЕ на ўдарнікаў

ЗБОЖЖАЗАГАТОЎЧАЙ КАМПАНІІ

Здача збожжа разгортваецца

БЯЛЫНІЧЫ.

Калгасы Бялыніцкага раёну пачалі арганізаваную здачу збожжа дзяржаве. Калгас «ЧЫРВОНЫ ЗМАГАР» здаў чырвоным абозам 4.800 клгр. збожжа. Калгас «МЕЛЬНІК» — каля 2.000 клгр., калгас «XII-ГОДЗЬДЗЕ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ» — 8.000 клгр.

МЕЛІХАЎ.

На здымку: Навань заводу імя Варашылава тав. КУЗЬНЯЦОЎ; працуе па сацыялістычным сумяшчэньні ў кампэрацыі.

Арганізавалі новы калгас

ТАЛАЧЫНА.

АГУЛЬНЫ СХОД СЯЛЯН ВЕСАК ЛІСОЎШЧЫНА І КАСЬПЕРАВА, АЗЯРЫЦКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, АБВЯСЬЦІЎ СЯБЕ МАБІЛІЗАВАНЫМ НА ПОЎНАЕ І СВАЯЧАСОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ЗАДАНЬНЯЎ ПА ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКАХ.

РАЗАМ З ПРЫНЯЦЬЦЕМ НОРМ ЗДАЧЫ ЗБОЖА СХОД ПАСТАНАВІЎ АРГАНІЗАВАЦЬ НОВЫ КАЛГАС ІМЯ 3-ГА РАШАЮЧАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ, У ЯКІ ЎЦЯГНУЦЬ УСІХ БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ ГЭТЫХ ВЁСАК. СХОД ВЫКЛІКАЎ ПАСЬЛЯДАВАЦЬ ГЭТАМУ ПРЫКЛАДУ СЯЛЯН ВЁСКІ КАНАПЕЛЬЧЫЦЫ.

Селькор В. А.

Плян павялічан на 15 цэнтнэраў

ТАЛАЧЫНА.

Калгаснікі калгасу «VI ЗЬЕЗД САВЕТАЎ» (Волкаўскі сельсавет) высунулі сустрэчны плян збожжазагатовак, ПАВЯЛІЧЫЎШЫ КАНТРОЛЬНУЮ ЛІЧБУ НА 15 ЦЭНТН. Адначасова калгаснікі пастанавілі датэрмінова і поўнасьцю здаць сельска-гаспадарчы падатак.

Калгаснікі выклікалі пасьледаваць гэтаму прыкладу калгасы «Камсамольская праўда» і «Чырвоны сьцяг».

***

16 жніўня ў Талачына прыбыў вялікі чырвоны абоз са збожжам, арганізаваны калгасамі «БЕЛАРУСКАЯ ВЁСКА», «ЯСНАЯ ПАЛЯНА», «КОЛАС», ІМЯ БУДЗЁННАГА І «ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА», З УДЗЕЛАМ БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ ВЕСКІ РАЗАНЫ. Абозам здана дзяржаве 11.400 клгр. ЖЫТА, 1.773 клгр ЯЧМЕНЮ. Каля прыёмнага пункту адбыўся лятучы мітынг, на якім чырвоны абоз віталі прадстаўнікі РК КП(б)Б, РВК і райвалтасаюзу. У адказ на прывітаньне калгаснікі запэўнілі РК КП(б)Б, што яны датэрмінова і поўнасьцю выканаюць заданьне па збожжазагатоўках і не накіруюць на прыватны рынак ні аднаго фунта збожжа.

УЛ. ВАНЦЭВІЧ.

АПАЛ—РАБОЧЫМ ЦЭНТРАМ

РАГАЧОЎ І КЛІМАВІЧЫ зрываюць дроваазагатоўкі

Весткі з месц сыгналізуюць аб поўнай пагрозе зрыву плянаў дроваазагатовак 1931 рашаючага году пяцігодкі.

На працягу ўсяго сэзону дроваласазагатовак ганебна адстаюць па выкананьні сваіх заданьняў Чэрвенскі, Нёманскі, Бярэзінскі, Пятрыкоўскі, Хойніцкі, Уборацкі і Прапойскі леспрамгасы.

Рэкорд на апартуністычную бязьдзейнасьць па выкананьні галавой праграмы дроваазагатовак набілі Хойніцкі, Бярэзінскі, Глускі, Тураўскі, Борквіцкі і Рэчыцкі леспрамгасы.

Асноўная прычына такога недапушчальна дрэннага становішча на дроваласазагатоўчым фронце, як пісала ўжо «Зьвязда», зьяўляецца «апартуністычная недаацэнка з боку кіраўніцтва раду раённых арганізацый і леспрамгасаў народна-гаспадарчага значэньня дроваласазагатовак».

Караспандэнцы з Клімаўшчыны і Рагачова, якія сёньня зьмяшчаюцца, з усёй выразнасьцю яшчэ раз пацьвярджаюць правільнасьць гэтай установкі.

Як і раней, пераважная большасьць леспрамгасаў працуе па-старому, ня думаючы перабудаваць сваёй работы ў адпаведнасьці з новымі задачамі, якія пастаўлены партыяй.

Абязьлічка і ўраўнілаўка, адсутнасьць брыгаднай сыстэмы работы і зьдзельшчыны заядаюць леспрамгасы.

Так, рэнгазэта «Чырвоная Тураўшчына», яка дала 5-га ліпеня аддзел пад шапкай аб тым, што «месячнік загатоўкі і вывазкі несаматар'яльна на нашым раёне пад пагрозай зрыву», зараз ні слова не гаворыць аб становішчы дроваагатовак у раёне.

А між тым, Тураўскі леспрамгас гадавое заданьне па загатоўках дроў на 11 жніўня выканаў усяго на 13,3 проц.

Абыходзіць мяўчаньнем у апошнія часы кампанію дроваагатовак і рагачоўская райгазэта «Камунар». А між тым, Рагачоўскі леспрамгас паказвае таксама ганебныя тэмпы работы.

Задача кожнай раённай газэты — на працягу бліжэйшых дзён па-бальшавіцку ўзяцца за асьвятленьне на сваіх старонках кампаніі ходу дроваагатовак, дапамагчы гэтым самым леспрамгасам выканаць у вызначаныя тэрміны пляны дроваагатовак.

Забясьпячэньне Менску дрывамі паранейшаму зрываецца. На працягу апошняй пяцідзеньскі паступіла замест 500 вагонаў толькі 45.

Дастаўка дроў у Менск зрываецца ў асноўным непадачай вагонаў чыгункай.

Так, з Глуску паведамляюць, што «вагонаў пад адгрузку дроў для адпраўкі ў Менск чыгунка не дае. Пляны адгрузкі дроў Менску зрываюцца. Грузчыкі — без работы.

Падобнага зьместу тэлеграма атрымана з Пятрыкоўскага леспрамгасу, дзе, між іншым; гаворыцца: «чыгунка падае вагоны для адгрузкі дроў толькі на поўдзень. Вагоны для адгрузкі дроў Менску чыгунка падаваць адмаўляецца».

Гэтыя тэлеграмы яшчэ раз прымушаюць нас з усёй рашучасьцю паставіць пытаньне перад чыгункай аб падачы неабходнай колькасьці вагонаў для адгрузкі дроў пралетарскім цэнтрам.

Паклясьці канец апартуністычнай бязьдзейнасьці

РАГАЧОЎ, 22. (Па тэлеграфу).

У 1931 годзе Рагачоўскі леспрамгас павінен загатовіць 160.275 кбм. дроў. На 11 жніўня загатоўлена 11.715 кбм., што складае 43,4 проц. гадавога пляну. Такое-ж становішча і з вывазкай дроў.

Асноўная прычына дапушчанага прарыву на фронце дроваагатовак — апартуністычная недаацэнка апошняй пастановы ЦКК і НК РСІ БССР аб дроваагатоўках з боку раённых арганізацый Рагачоўшчыны і поўная бязьдзейнасьць сельскіх саветаў.

Кожны дзень у леспрамгасе павінна працавацъ ня менш 2.700 фурманак і 1.332 лесарубаў.

Фактычна працуе штодзённа ня больш 250 лесарубаў і каля 200 фурманак.

Баравікоўскі, Запатускі, Сляпёнаўскі, Чарнінскі і Дзюрдзілўскі сельсаветы зусім зрываюць кампанію дроваагатовак, адмаўляючыся даваць і лесарубаў і фурманкі.

Райвыканком ня прымае ніякіх мер да гэтых сельсаветаў, якія груба ігнаруюць дырэктывы партыі і ўраду аб 100 проц. выкананьні вызначаных пляноў дроваагатовак.

У Рагачоўскім раёне плян дроваагатовак — пад пагрозай. Задача партыйнай арганізацыі і ў першую чаргу органаў РСІ — па-бальшавіцку ўзяцца за рэалізацыю дырэктыў партыі аб дроваагатоўках і забясьпечыць на працягу жніўня і верасьня поўнае выкананьне вызначаных пляноў загатовак і вывазкі.

У Клімаўшчыне... „дагаворваюцца"...

Клімавіцкі леспрамгас яшчэ і зараз працуе па-старому. На лесазагатоўчых вучастках працуюць арцелі. Брыгады метад работы леспрамгасам не выкарыстоўваецца, што наносіць моцны ўдар па свячасовым выкананьні вызначаных пляноў дроваагатовак і вывазкі.

У выніку—у другім квартале плян дроваагатовак выкананы толькі на 10,7 проц. Вывезена 9,1 проц. ад улынага пляну.

Такое становішча мы маем і ў трэцім квартале 1931 году.

Гэтыя факты—яркія паказальнікі глыбокага прарыву на фронце дроваагатовак ў Клімавіцкім раёне.

Забясьпячэньне дрывамі гораду—пад пагрозай. У гэтым годзе рабочыя і служачыя гораду будуць забясьпечаны дрывамі не ў цэнтралізаваным парадку, як было раней, а выключна пляцам самазагатовак.

На працягу трэцяга і чацьвертага кварталаў 1931 г. патрэбна загатовіць такім парадкам 5.400 кубаметраў дроў, але ў Клімавічах ніхто пальцам аб палец ня ўдарыў для таго, каб нават пры ступіць да гэтай работы.

Райсаюз, гарпо і райпрафсавет, якія ў першую чаргу павінны ініцыяваць аб свячасовым забясьпячэньні дрывамі рабочых і служачых, пакуль што «дагаворваюцца» паміж сабою і леспрамгасам і ніякіх канкрэтных мер у выраўнаньні гэтай задачы ня прымаюць.

Леспрамгас павінен безадкладна адвесьці поўны вучастак лясной плошчы для загатоўкі і вывазкі гораду дроў.

Задача партыйнай арганізацыі, прафсаюзаў і іншых раённых установаў—па-бальшавіцку пераключыцца на хутчэйшую рэалізацыю рашучых дырэктыў партыі аб дроваагатоўках і зарас-жа прыступіць да загатовак 5.400 кубаметраў дроў, патрэбных гораду.

Студэнты.

БАРАЦЬБА ЗА ПРАМФІНПЛЯН

„БАЛЬШАВІК" ТРЫМАЕ пераходны сьцяг

ЗА 20 ДЗЁН ЖНІЎНЯ

завод выканаў праграму на 109 %

ХРОМАВЫ ЦЭХ ІДЗЕ ПЕРШЫМ

Гарбарня «БАЛЬШАВІК» за 20 дзён жніўня выканала прамфінплян у колькасных паказальніках на 109,5 проц. і па цэннасным — на 122,1 проц. Паранейшаму ўперадзе ідзе першы хромавы цэх, які выканаў заданьне па колькасных паказальніках на 113,24 і па цэннасных — на 130,12 проц. Другі хромавы выканаў заданьне па колькасных паказальніках на 163,2 проц. і па цэннасных — на 117,72 проц.

Завод «Чырвоны мэталіст». На здымку: БУЛЬБАКАПАЛКА.

„ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК" ШТУРМУЕ ПРАРЫВЫ

На фабрыцы «Чырвоны Кастрычнік» (Мазыр) абвешчан з 1-га жніўня штурм на ліквідацыі прарываў першага паўгодзьдзя. Разгорнута сацыяборніцтва і ўдарніцтва на зьменах і цэхах. Рабочы калектыў мабілізаваўся на барацьбу за плян. У выніку ўжо за апошнюю дэкаду ёсьць значны ўрух. Выпрацоўка ў суткі даходзіць да 83 прасаў і да 5.000 лістоў шпоны.

Вялікай перашкодай у барацьбе за плян зьяўляецца дрэнная наладжаньне грамадзкага харчаваньня. У сталоўцы вялікія чэргі, дрэнная якасьць абедаў, нярэдка за абедам не хапае хлеба. Заўкам і камбюро ніякіх мер ня прымаюць да наладжаньня грамадзкага харчаваньня.

Яргопін.

Прыхільнікі „аб'ектыўных прычын"

ГЛУСК.

Глускія загатоўчыя арганізацыі не падрыхтаваліся да сустрэчы новага ўраджаю. Толькі 14 жніўня пляны збожжазагатовак былі разасланы па сельсаветах і калгасах. Райсажыўсаюз, прыкрываючыся розными «аб'ектыўнымі» прычынамі (недахват работнікаў і г. д.), злачынна бязьдзейнічае і зусім ня ініцыюе загатоўкам. Дакуль аказаць, што да гэтага часу ў раёне яшчэ не арганізавана загатоўчая кампанія.

13 і 14 жніўня калгаснікі 1 аднаасобнікі Марнавіцкага сельсавету накіравалі ў Глуск чырвоны абоз са збожжам. Аднак, склады ня былі падрыхтаваны да прыёму збожжа, і калгаснікам доўга прышлося шукаць, куды ссыпаць збожжа.

СЫГНАЛ З РЭЧЫЦЫ

ДА СУРОВАГА АДКАЗУ

АПАРТУНІСТАЎ-„КІРАРАЎНІКОЎ" ЗАВОДУ „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"

ЗЬНЯЦЬ З РАБОТЫ ГЛУШЫЦЕЛЯЎ РАБОЧАЙ ІНІЦЫЯТЫВЫ

Апартуністычнае кіраўніцтва заводу «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» (Рэчыца) не забясьпечыла пералому ў барацьбе за плян. Ня гледзячы на тое, што зараз завод поўнасьцю забясьпечаецца сыр-цом, плян за пітань месяц выкананы на 30 проц. Прарыў тлумачыцца выключна апартуністычнай практыкай кіраўніцтва заводу. Работа не перабудзена.

Адсутнасьць кіраўніцтва, поўнае ігнараваньне ўдарнага руху з боку партячэйкі і заўкому прывяло да таго, што ў цьвікоўным і дротавым цэхах ударныя брыгады развяліся. Зусім абуральным фактам зьяўляецца тое, што заводзкія арганізацыі на разгавалі на роспуск загадчыком шрубавага цэху тав. БАБРОЎНІКА ўдарнай зьмены з моладзі, якая спаборнічала са зьменай дарослых.

Апартуністычнае кіраўніцтва заводу груба зацісае самакрытыку, не рэагуе ні на адзін допіс рабкораў. За апошні час у газэце было зьмешчана больш 20 допісаў, якія патрабавалі прыняцьця неадкладных мер, але яны засталіся без адказу. У выніку рабкоры кінулі пісаць. Калі старшыня рэдкалегіі аб гэтым пачаў гаварыць з сакратаром парт'ячэйкі БАБЧОНКАМ, апошні адказаў: «ПІШЫЦЕ САМІ, КАЛІ НЯМА РАБКОРАЎСКАГА МАТАР'ЯЛУ».

У механічнай майстэрні быў вырваны з насьценгазэты допіс, які крытыкаваў адміністрацыю, калі па гэтым пытаньні зьвярнуліся да цэхпарторга тав. БАГДАНОВІЧА, ён даў «параду»: «ВЕШАЙЦЕ ГАЗЭТУ НА СТОЛІ, АДТУЛЬ ЗЬДЗІРАЦЬ НЯ БУДУЦЬ». На такое нахабнае выступленьне ніхто не рэагаваў.

Л. ЛЮБАМІРСКІ.

На здымку: будаўніцтва галоўнага корпусу гарадоцкага турбіннага ільнозаводу.

ПЛЕНУМ БЕЛБЮРО ЦК ЧЫГУНАЧНІКАЎ

420 выпадкаў зрыву спаранай язды ў Гомелі

НА ВІЦЕБСКІМ ВУЗЬЛЕ

толькі 4 паравозы з 160

ПЕРАВЕДЗЕНЫ НА ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК

Забясьпечыць баявую падрыхтоўку да асеньня-зімовых перавозак

Яшчэ і па сёньнешні дзень адна з важнейшых дырэктыў партыі аб пераводзе ўсіх зьвеньняў транспарту на гаспадарчы разрахунак не ажыцьцёўлена. Асабліва дрэнная справа з пераводам на гаспадарчы разрахунак паравознага парку.

Толькі арганізацыі Гомельскага раёну рашуча па-бальшавіцку ўзяліся за пераводпаравознага парку на гаспадарчы разрахунак. На сёньнешні дзень у Гомелі пераведзены на гаспадарчы разрахунак 65 паравозаў, у Калінкавічах 6 (з 8).

Іншыя вузлы ганебна цягнуцца ў хвосьце. Напрыклад, па Аршанскім вузле на гаспадарчы разрахунак пераведзены толькі 10 паравозаў, у Полацку — 4 паравозы з 23-х і г. д..

Рэкорд бязьдзейнасьці па пераводзе паравозаў на гаспадарчы разрахунак набілі арганізацыі Віцебскага вузла, якія з 160 паравозаў пераявілі на гаспадарчы разрахунак толькі 4.

Дэпо па ўсіх вузлах пераведзены на гаспадарчы разрахунак толькі фармальна. На 2-м пленуме ЦК Белбюро чыгуначнікаў старшыня Віцебскага вучрайпрафсаўу вымушан быў прызнацца, што пляны пераходу дэпо на гаспадарчы разрахунак былі даведзены да дэпо толькі... «два дні таму назад».

Рабочы тав. Злотнікаў на пленуме прывёў рад фактаў аб дрэннай рабоце Гомельскага дэпо. Няма правільнай расстаноўкі рабочай сілы, часта мяняюць начальнікаў і майстраў дэпо.

Паравозы паступаюць у прамыўку ня ў цяпнавым парадку. Ад такой бясплянавасьці ёсьць шмат выпадкаў, калі рабочым няма чата рабіць, або ня ведаюць за якую работу раней брацца.

Тав. АЛЯКСЕЕВА (Жлобінскі раён) расказала, што кандуктарская брыгада Жлобіна не забясьпечана сыгнальнымі прыладамі. У часе адпраўкі цягнікоў часта можна назіраць такі малюнак, шот кандуктары бегаюць у пошуках за сыгнальнымі сьцяжкамі...

Спаранае язда яшчэ не замацавана. Па Гомелі з 1-га мая па 20-та ліпеня было 420 выпадкаў зрыву спаранай язды. Па Віцебску за чэрвень і 20 дзён ліпеня зрыў спаравай язды па віне машыністаў дасягаў 32 проц., памочнікаў машыністаў — 32 проц. і па віне качагараў — 70 проц. Па Воршы меўся поўны зрыў спаранай. На ліпеня стаіць справа і па іншых вучастках.

У маневровых работах існуе поўная абязьлічка.

Па Гомельскім вузле, як і па іншых, надзвычайна вялікі процант хворых вагонаў. Згодна пляну, Гомельскі раён павінен быў давесьці процант хворых вагонаў да 0,9 проц., а фактычна на сёньнешні дзень ён дасягае 1,06 проц.

Колькасьць адчэпак па Гомельскім раёне ў першую дэкаду ліпеня павялічылася супроць апошняй дэкады чэрвеня на 50 проц., па Віцебску было 260 адчэпак у месяц, а прычыны гарэньня буксаў і 300 іншых тэхнічных прычынах. Па Жлобіне за 2 дэкады ліпеня было 160 адчэпак, а па Гомелі за готы-ж тэрмін 133 выпадкі і г. д.

Жыцьлёвае будаўніцтва — вузкае месца на чыгуначным транспарце. Плянны будаўніцтва зрываюцца а гэта ў сваю чаргу адмоўна адбіваецца на вярбоўцы рабсілы для асеньня-зімовых перавозак.

Загад дырэкцыі чыгунак аб хаваньні спецвопраткі пры прадпрыемствах гаспадарчыні арганізацыямі ня выконваецца а тэй прычыны, што да гэтага часу ніхто не клапоціцца аб памяшканьнях і шафах для хаваньня апошніх.

Даста

Адзін палітзьняволены задушан, 4—пры сьмерці і дзесяткі пакалечаных— вось крывавае жніво акупантаў у Горадзенскай турме

ЗАМУЧАНАГА РАБОЧАГА ПАЛІЦЭЙШЧЫНА ХАВАЛА НОЧЧУ

ЗНОЎ ГАЛАДОЎКА ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ У ВАРШАВЕ

ПРАЦОУНЫЯ УСЯГО СЬВЕТУ НІКОЛІ НЕ ЗАБУДУЦЬ ЗАГІНУУШЫХ ТАВАРЫШОУ!

Год выданьня—XV
№ 229 (4134)
Панядзелак 24 жніўня 1931
Цана нумара 5 кап.
БЕСЬПЕРАПЫННА

Зьвязда

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І ТЭХНІЧНАЯ МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.
Тэлефоны:
рэдактар—6-21,)—сакратар—10-74, пертсек тар—13-80, прамысл.—13-80, сель. гасп.—6-19, мясн. інфарм.—6-19, гасп. інфарм.—6-19, навук рэдактар—8-42, міжнародны інфармацыя—10-74, натуральны—8-781, парт. абвестка—7-51.

ВІЛЬНЯ, 23. (Наш кар.). Тое, што адбываецца зараз у засьценках фашысцкай Польшчы над палітзьняволенымі, не паддаецца апісаньню. Валасы на галаве ўстаюць дыбам. Перадсьмяротныя стогны закатаваных таварышоў нясуцца па ўсім сьвеце і выклікаюць у кожнага рабочага і працоўнага прагненьне бязьлітаснай помсты фашысцкім катам.

Пасьля крывавай расправы фашысцкай улады над палітзьняволенымі Лукішак, Пінску, чарга дайшла і да Горадні, дзе зараз заключан Б. ТАРАШКЕВІЧ, правакацыйна, пры дапамозе беларускіх нацыянал-фашыстаў—Астроўскага, Луцковіча, Акінчыца і к-а — зрыштаваны ў міжнародным вагоне ў часе праезду праз Данцыгскі калідор. Пры чытаньні лістоў палітзьняволеных з Перамышля, Пінску і іншых турмаў — кроў закіпае ў жылах, але каты Гарадзенскай турмы на многа выперадзілі «малайцоў» з Пінску.

Галадоўка 150 палітзьняволеных Горадзенскай турмы, як ужо зазначалася на старонках савецкай прэсы, пачалася 7-га жніўня. Галадоўка насіла надзвычай бурны характар. Не дарма начальнікам гэтай турмы зьлупяшча вядомы кат — садыст Грабоўскі, які ўласнаручна закатаваў ні аднаго ўжо палітзьняволенага, а турэмная адміністрацыя падабрана выключна з фашысцкіх апрычнікаў. Ужо на другі дзень у турму была ўведзена паліцыя і жандармерыя, ЯКАЯ, ПАД КІРАЎНІЦТВАМ САМОГА ПРАКУРОРА І КАТА ГРАБОЎСКАГА НАЛАДЗІЛА КРЫВАВУЮ ЛАЗЬНЮ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫМ. Галадоўка перарвана была ў суботу 15 жніўня на 9-ты дзень. Гэта галадоўка каштавала вялізарных ахвяр. Зграя турэмных белабандытаў гуляла ва ўсю. У выніку АДЗІН ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫ, ПЕРАПЛЁТЧЫК - РАБОЧЫ СКЕЛЬЧЫК ЗАДУШАН; 4 ІНШЫХ НАШЫХ ТАВАРЫШОЎ ЗНАХОДЗЯЦЦА ПРЫ СЬМЕРЦІ, А ДЗЕСЯТКІ ПАКАЛЕЧАНЫХ А АКРЫВАЎЛЕНЫХ ТАВАРЫШОЎ ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў ТУРЭМНЫМ ШПІТАЛІ.

ПАХАВАНЬНЕ ЗАМУЧАНАГА ТАВ. СКЕЛЬЧЫКА АДБЫЛОСЯ звычайным паліцэйскім спосабам, ПАТАЕМНА, НОЧЧУ, ПРЫЧЫМ, ТРУНА ДА МОГІЛАК БЫЛА АБКРУЖАНА ПАЛІЦЫЯЙ. ФАШЫСЦКІЯ КАТЫ БАЯЛІСЯ ГНЕВУ РАБОЧЫХ МАС, баяліся магутных дэманстрацый пратэсту, таму прымушаны былі хаваць сваю ахвяру патаемна, ноччу.

Замучаны тав. Скельчык — яшчэ адна ахвяра фашысцкага тэрору ў турмах белапанскай Польшчы. Працоўныя масы Польшчы і Зах. Беларусі ніколі не забудуць сваіх загінуўшых таварышоў у няроўнай барацьбе супроць фашысцкай дыктатуры, за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне з-пад ярма белапольскіх акупантаў

Галадоўка палітзьняволеных на Павіяку

ВАРШАВА, 21. У сувязі з увядзеньнем у Польшчы новага турэмнага рэгляменту, які скасоўвае прывілеі палітзьняволеных у турмах і ставіць палітзьняволеных у становішча крымінальных, у варшаўскай турме «Павіяк» палітзьняволеныя абвясьцілі галадоўку.

Турма захоўваецца ўзмоцненымі паліцэйскімі пастамі (ТАСС).

Па ўсёй Польшчы коціцца хваля забастовак

ВАРШАВА, 21. Саюзы прадпрыемцаў амаль усіх галін прамысловасьці вядуць узмоцненае наступленьне на эканамічныя заваяваньні рабочай клясы, імкнучыся за кошт рабочых аспабіць руйнуючыя ўдары гаспадарчага крызісу.

Прадпрыемствы апрацоўчай металёвай прамысловасьці ў Верхняй Сілезіі абвясьцілі 10-ці процантнае зьніжэньне зарплаты. Прадстаўнікі рабочых патрабаваньне гэта катэгарычна адкінулі. На ўсіх заводах ідзе падрыхтоўка да забастоўкі.

Яшчэ большае зьніжэньне зарплаты праводзяць уласьнікі чыгуна-ліцейных заводаў. Паміма агульнага 15 процантнага зьніжэньня зарплаты, на 50 проц. абрэзваюцца акордныя стаўкі. Сярод рабочых панае вялізарнае абурэньне.

Гэта дранежніцкае наступленьне капіталістаў выклікае жорсткі адпор з боку рабочай клясы. Па ўсёй Польшчы коціцца хваля забастовак.

За апошнія часы асабліва ўзмоцнілася барацьба Беластоцкіх тэкстыльшчыкаў. Ужо два тыдні працягваецца забастоўка на фабрыцы плюшу Бэкера. Забастоўка распачалася з прычыны звальненьня часткі рабочых і непрызнаньня прафсаюзу. На фабрыцы Падшыбоўкага выбухнула забастоўка — другая на працягу некалькіх месяцаў. Рабочыя дамагаюцца спыненьня масавых звальненьняў, якія праводзіць прадпрыемца. У адказ на гэта фабрыкант зрабіў так званы «чорны сьпіс» бастуючых рабочых і адаслаў яго другім фабрыкантам, каб яны ня прымалі на работу гэтых рабочых. Але гэта мерапрыемства эксплёататараў яшчэ больш узмоцніла рашучасьць рабочых. На ліцейным заводзе Готліба ўжо некалькі дзён бастуюць рабочыя, якія дамагаюцца выдачы навыплачанай зарплаты.

Як паведамляе сацыял-фашысцкі «Роботнік» у Сколэм распачалася агульная забастоўка тартачных рабочых. Імкнучыся зламаць барацьбу, праўленьне фірмы ўзяло на працу ўсіх ляськоў і лясных рабочых, а таксама служачых фірмы. Некалькі соцень бастуючых рабочых, даведаўшыся аб гэтым, прыйшлі, каб зьняць з працы штрэйкбрэхераў. Прадпрыемца выклікаў вялікі атрад паліцыі. Паліцыя з заяводжім камэндантам на чале з нябачанай жорстасьцю накінулася на рабочых і пачала іх зьбіваць прыкладамі. Рабочыя адказалі градам каменьняў. Паранена 6 паліцэйскіх. Колькасьці ахвяр з боку рабочых фашысцкі друк не падае. У сувязі з гэтым арыштавана некалькі рабочых.

У Крулеўскай гуце праўленьне дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў Стэрнбэрга абвясьціла пёкаут усіх рабочых, якія не згадзіліся на 15 проц. зьніжэньне зарплаты.

На фабрыцы цэменту ў Шчакаве бесьперапынна адбываюцца скарачэньні рабочых. 15-га жніўня праўленьне фабрыкі абвясьціла аб новых звальненьнях, якія закранулі 280 рабочых. Прадпрыемствы Фібіпса звольнілі 200 рабочых і служачых. Уласьнік шкляной гуты ў Аржэшу звольніў некалькі соцень рабочых. Пры звальненьні прадпрыемца адмовіўся ўрэгуляваць навыплачаную за некалькі тыдняў зарплату.

Фашысцкая «Газэта Варшаўска» паведамляе, што 200 рабочых, якія былі заняты пры пабудове палацу для прэзыдэнта Польшчы, падалі на валодзтва ў суд за адмаўленьне выплаціць зарплату, якая ім належала за некалькі месяцаў.

Паводле ўрадавай статыстыкі, лічба зарэгістраваных беспрацоўных у фашысцкай Польшчы на 15-га жніўня дасягнула 253.943 чал. За апошнія часы беспрацоўе пачало значна ўзрастаць у буйных прамысловых цэнтрах, як Варшава, Лодзь, Чэнстахоў, Верхняя Сілезія і г. д.

ВЫРВЕМ З РУК КАТАЎ

ГЕРАІЧНЫХ БАРАЦЬБІТОЎ ЗА СУСЬВЕТНЫ КАСТРЫЧНІК!

РАСЬЦЕ ЛАВІНА ПРАТЭСТАЎ

„Браты, мы чуем ваш голас!

ЗМАГАЙЦЕСЯ, ВЫ НЕ АДНЫ“

10 тысяч палітзьняволеных пакутуюць у вастрогах фашысцкай Польшчы. Масавыя арышты павялічваюць іх лічбу з кожным днём. Абвостранае наступленьне турэмных катаў пагражае фізычным зьнішчэньнем палітзьняволеным.

МЫ, КАЛГАСЬНІКІ, БЕДНЯКІ І СЕРАДНЯКІ — АДНААСОБНІКІ — ЗАЎТРАШНІЯ КАЛГАСЬНІКІ, МАЛЕВІЦКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, ЖЛОБІНСКАГА РАЁНУ, сумесна з нашымі шэфамі — рабочымі дэпо, сабраўшыся ў дзень нашай перамогі на фронце сацыялістычнай перабудовы вёскі, у дзень завяршэньня ў асноўным суцэльнай калектывізацыі бядняцка-сераднякіх гаспадарак на тэрыторыі сельсавету — узьнімаем свой рашучы голас пратэсту супроць нячуваных катаваньняў і зьдзекаў польскага фашызму над вамі, — барацьбітамі за Савецкую Польшчу.

ВАМ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗІЦЕСЯ ЗА КРАТАМІ ПОЛЬСКІХ ТУРМАЎ І СТОГНЕЦЕ ПАД БОТАМ БЕЛАПОЛЬСКАГА АКУПАНТА, ПРАЦОЎНЫМ МАСАМ ПОЛЬШЧЫ, ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ І ЗАХОДНЯЙ УКРАІНЫ — МЫ ШЛЕМ СВАЁ ШЧЫРАЕ, БРАЦКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ.

Браты па клясе, палітзьняволеныя Польшчы, мы чуем ваш голас, вы не адны.

Вам на дапамогу ідзе магутная рэвалюцыйная хваля, якая ўшчэнт зьнішчыць капіталістычную сыстэму.

Мы працягваем вам сваю брацкую руку, арганізуючы шырокі збор сродкаў сярод калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў сельсавету і ўносім у адказ на адозву ЦК МОПР'у Польшчы, Заходняй Беларусі 500 РУБЛЁЎ.

Мы заклікаем вас, працоўныя Польшчы, Заходняй Беларусі і Украіны, цясьней згуртавацца пад сьцягамі камуністычнай партыі, для барацьбы з польскім фашызмам, за Савецкую Польшчу.

Мы заклікаем рабочых, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў — аднаасобнікаў Жлобінскага раёну ўзьняць свой голас рашучага пратэсту, арганізаваць шырокі збор сродкаў на дапамогу палітзьняволеным Польшчы і іх сем'ям.

Далоў белы тэрор!

Далоў фашысцкую дыктатуру Пілсудзкага! Далоў фашысцкі турэмны рэгламант! Далоў арганізатараў нападу на СССР!

Няхай жыве кампартыя Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны!

Няхай жыве сусьветная пралетарская рэвалюцыя!

„Не дамо загінуць нашым братом“

Да ўсіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў!

ДУБРОЎНА, 22. (БЕЛТА). Мы, старшыні калгасаў Дубровенскага раёну, сабраўшыся на нараду па абгаварэньні пытаньняў сацыялістычнага будаўніцтва нашай сельскай гаспадаркі, выносім свой голас пратэсту супроць катаваньняў і жудасных зьверскіх забойстваў палітзьняволеных фашысцкай Польшчы.

Фашысцкі ўрад Пілсудзкага сваім гаспадараньнем прывёў працоўныя масы Польшчы, Зах. Беларусі і Зах.. Украіны да нячуванай галечы і голаду. Карнымі экспэдыцыямі, крывавым тэрорам прабуе ўстрымаць нарастаючую рэвалюцыйную хвалю

Крыкі і стогны скатаваных, змораных галадоўкамі палітзьняволеных разносяцца з усіх фашысцкіх турмаў.

Т. т. калгасьнікі, калгасьніцы, беднякі, серадняки і аднаасобнікі, не дамо загінуць нашым братом і сёстрам па клясе, кінутым у засьценкі фашысцкіх турмаў! Акажам брацкую дапамогу 10.000 рэвалюцыянэрам, якія вядуць сьмяротную барацьбу супроць сваіх катаў.

Лепшым адказам на фашысцкі тэрор Пілсудзкага зьяўляецца пасьпяхова скончаная ўборка ўраджаю, выкананьне пляну здачы лішкаў дзяржаве, поўнае выкананьне вытворчых пляноў нашай гаспадаркі.

Усе, як адзін, у рады МОПР'у і Асоавіяхіму!
Усе, як адзін, на дапамогу палоньнікам фашызму!

Прэч польскі фашызм!

Прэч катаў - забойцаў!

Няхай жыве рэвалюцыйнае змаганьне рабочых і сялян Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны!

ПРЭЧ фашысцкіх апрычнікаў

РЭЗАЛЮЦЫЯ ПРАТЭСТУ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАГА КАЛГАСУ „СЕРП І МОЛАТ“

ГЛУСК, 22. (БЕЛТА). Прачытаўшы адозву ЦК камуністычнай партыі Польшчы, ЗБ і ЗУ і ЦК МОПР'у Польшчы і Заходняй Беларусі, мы, калгасьнікі інтэрнацыянальнага (беларуска-польскага) калгасу «Серп і молат», Клятнянскага сельсавету, Глускага раёну, выказваем сваю глыбокую салідарнасьць з братамі па клясе, якія, пад кіраўніцтвам кампартыі, вядуць гераічную барацьбу супроць фашысцкай дыктатуры, супроць белага тэрору, за саветы, за сусьветную пралетарскую рэвалюцыю.

Мы рашуча пратэстуем супроць зьдзекаў фашызму над барацьбітамі, ганьбім фашысцкіх апрычнікаў. Мы далучаемся да ўсеагульнага шматмільённага пратэсту працоўных і выносім свой рашучы пратэст супроць фізычнага зьнішчэньня 10.000 рэвалюцыянэраў.

Дарагія таварышы, працоўныя сяляне Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны! Змагайцеся да поўнай перамогі. У нашай дапамозе будзьце ўпэўнены.

У адказ на адозву, мы, калгасьнікі калгасу «Серп і молат», адлічваем адзін процант свайго месячнага заработку ў дапамогу палітзьняволеным і іх сем'ям. Усе, як адзін, уступаем у рады МОПР'у і Асоавіяхіму.

Пілсудчыкам не затаіць у крыві рэвалюцыйны ўздым працоўных Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Прэч фашысцкія рукі ад барацьбітоў за сусьветны Кастрычнік!

Далоў белы тэрор, далоў фашысцкую дыктатуру Пілсудзкага!

Няхай жыве рабоча-сялянская ўлада Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

***

Рэзалюцыі пратэсту супроць фізычнага зьнішчэньня рэвалюцыйных барацьбітоў у засьценках фашысцкай Польшчы паступаюць у рэдакцыю бязупынна. Усюды рабочыя і прапрэўные сялянства ў адказ фашысцкім катам адлічаюць частку свайго заработку, а таксама зьбіраюць сродкі па падпісных лістох на дапамогу палоньнікам фашызму. Рэзалюцыі пратэсту атрыманы яшчэ ад рабочых фабрыкі «Прафінтэрн» ад рабочых Эльводу гор. Магілева і інш.

Кампартыя Нямеччыны разгортвае вялікую масавую работу на вёсцы
На здымку: Начны мітынг на вёсцы, скліканы кампартыяй.

„ПРЫ КАПІТАЛІЗЬМЕ ГРАМАДЗТВА НЯ МОЖА БОЛЬШ РАЗЬВІВАЦЦА“

АДОЗВА АНГЕЛЬСКАЙ КАМПАРТЫІ

ЛЁНДАН. У «Дэйлі Уоркер» надрукавана адозва палітбюро ангельскай кампартыі ў сувязі з апошнім дакладам урадавай камісіі аб эканоміі.

Указваючы на ліхаманкавую дзейнасьць ураду па прэзэрвацыі эканомі, прапанаванай камісіяй, адозва зазначае, што «усё гэта азначае мабілізацыю ўсіх сіл капіталізму для ратаваньня капіталізму». У адозве далей гаворыцца: «Пры капіталізьме грамадзтва ня можа больш разьвівацца».

Указваючы далей на абвастрэньне беспрацоўя, на рост галечы, адозва гаворыць, што адказам капіталістаў на гэта становішча зьяўляецца ўзмацненьне наступленьня на жыцьцёвы ўзровень, якое ў выніку прыводзіць да яшчэ большага паглыбленьня сусьветнага эканамічнага крызісу.

Пераходзячы далей да фінансавага лянсаваць бюджэт за кошт працоўных мас, адозва ўказвае: «Чаму дзяржаўны бюджэт не збалянсаваны? Таму, што 350 млн. фунтаў стэрлінгаў ідзе штогод на ўплату процантаў трымальнікам ваеннай пазыкі, якія з моманту скончэньня вайны атрымалі ўжо ня менш 4 млр. фунтаў стэрлінгаў, г. зн. суму, якая раўняецца ўсёй ваеннай пазыцы, і ў той-жа час «доўг» застаецца нэўплачаным. Бюджэт ня можа быць збалянсаваны яшчэ і таму, што 110 млн. фунтаў стэрлінгаў працяцца штогод на ваенныя падрыхтоўкі. Мільёны фунтаў стэрлінгаў выдаткоўваюцца на задушэньне паўстаньняў індысійкіх і кітайскіх рабочых і сялян».

Выкрываючы далей ільжывасьць лёзунгу рабочага ўраду «роўныя ахвяры для ўсіх», адозва ўказвае, што «ня можа быць «роўных» ахвяр пры капіталізьме. Вялікія ахвяры для рабочых азначаюць павялічэньне голаду, хвароб і сьмяротнасьці. Няхай урад збалянсуе бюджэт шляхам канфіскацыі маёнткаў багатых, шляхам анулявання дзяржаўнага доўгу, шляхам выгнаньня паразытаў.

«Спыніць выдаткі на ваенныя апэрацыі ў Бірме і Кітаі, спыніць выдаткі на падрыхтоўку вайны, спыніць утрыманьне армій ў калёніях».

Адозва заклікае рабочых ісьці на шляху, які паказан расійскай рэвалюцыяй і канчаецца заклікам да дзеяньня, да мабілізацыі мас на барацьбу супроць зьнішчэньня жыцьцёвага ўзроўню пад лёзунгам: «Ні аднаго пені з рабочых, прымусіць гаспадароў несьці ахвяры. Ні аднаго пені на падрыхтоўку вайны».

Братаньне рабочых з салдатамі ў Францыі

ПАРЫЖ. «Юманітэ» паведамляе аб братаньні салдат, якія вярнуліся з манэўраў, з рабочымі ў горадзе Гізэ (цэнтр мэталюргічнай прамысловасьці Натскага дэпартамэнту). Рабочыя сустрэлі салдат з шырокім чырвоным плядкатам, з надпісам: «Прэч вайну» і раздавалі салдатам адозвы, дзе быў заклік да братаньня з рабочымі і да абароны СССР. На вайсковых могілках гор. Гіз БЫЎ ПАДНЯТ ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ І РАЗЬВЕШАНЫ ПЛЯКАТЫ З НАДПІСАМІ: «ТУТ ПОКОЯЦЦА АХВЯРЫ БОЙНІ 1914 І 18 ГАДОЎ», «ПРЭЧ ВАЙНУ», «НЯХАЙ ЖЫВЕ СССР».

Карэспандэнт «Юманітэ» паведамляе, што ўсе намаганьні паліцыі і жандармэрыі зьняць гэтыя плякаты і сьцяг і перашкодзіць братаньню салдат з рабочымі аказаліся БЯЗРЭЗУЛЬТАТНЫМІ. (ТАСС).

Праграма радыё перадач

ПАНЯДЗЕЛАК, 24-га ЖНІЎНЯ:

6-00—Фізкультура і раніцнія навіны (трансьл. Масквы).
7-00—Перадачы радыёграм.
10-11—Бязбожны раніцнік. Р/г «Калгасны Заклік».
11-13—Рабочы поўдзень (трансьл. Масквы).
17-25—Прагноз надвор'я на заўтра.
17-30—Канцэрт для выходнікаў і зьменных рабочых.
18-30—Перадача на мове польскай эсперанта.
18-55—Музычны адпачынак.
19-00—Р/г «Піянэр Беларусі» з музыч ілюстрац.
19-30—Р/г «За бальшавіцкія тэмпы».
19-55—Музычны адпачынак.
20-00—Р/г «Камсамолец Беларусі».
20-25—Музычны адпачынак.
20-30—Р/г «Калгасны заклік».
20-55—Музычны адпачынак.
21-00—Навукова-тэхнічная перадача.
21-30—Канцэрт.
23-30—Вячэрні выпуск. Р/г «За бальшавіцкія тэмпы».

Паведамленьні

— Парт. тройка Мен. ГарКК КП(б)Б выклікае на 25 жніўня г. г., у 6 гадз. веч. (Энгельса, 28, пакой 14) наступных т.т. СОСНЭР З. Ш. (калгасная школа), КІСЯЛЁЎ П. БАЛАЎ В. (пэдфак БДУ), ІГНАТОВІЧ (абутк. майст. Гарсавету), БІРГЕР А. І. (Беллдзяржкіно), БЛАГЕР (Менбуд), АПАЛОНАЎ Е. П. (зав. «Чырвоны Хомік»), ГІНЗБУРГ З. К. (Белматаліаб'яднаньне), БАДЗЕЕЎ М., ГРЫШЧАНКОЎ С. І. (яч. 5 узвод аховы МВБ чыг.), ЗАШТОФТ С. К., БЕКІШ В. (шклозавод) для ўдзелу і разгляду іх спраў. Таксама выклікаюцца сакратары ячэек, дзе гэтыя т.т. лічацца на вучоце. Яўка ўсіх памянёных т.т. абавязкова.

— Выязная ПТ ЦКК КП(б)Б будзе працаваць у г. Мазыры па разборы апэляцый пад старшынствам члена ПК ЦКК КП(б)Б т. Кофцерава. Выклікаюцца наступныя т. т.:

На 25-VIII

Говар І. Я. — Мазырскі раён (вёска Туравічы), Ражок К. П. — Мазырскі раён (п. Прудок), Булаўко Л. — Калінкавічы, Фралоў Ю. А. — ст. Гароччы, Заходн. чыг., Веко К. К. — Мазырскі раён (в. Гародзічы), Давідовіч А. І. — Капаткевіцкі раён, Панамароў І. І. — г. Мазыр, Гарбатоўскі А. А. — г. Мазыр, Аўсянка П. М. — Мазырскі раён (в. Запалье), Кавальчук — Мазырскі раён, Кісялеў Р. — Мазырскі раён, Розіна М. — г. Мазыр (фабр. «Чырв. Кастр.»), Рэкш Р. — Мазырскі раён, Багланаў М. А. — Лельчыцкі раён (в. Астрожанка), Гонікман О. Л. — Лельчыцы, Ліх Макар — Лельчыцы.

На 26-VIII 31 г.

Кісялёў Р., Худалееў М. — Пятрыкоўскі раён, Гінзбург С. Х. — Пятрыкоўскі раён, Фрайбман П. — Азарыцкі раён, Сацовіч М. Р. — Жыткавіцкі раён, Гаўрыленка С. В. — Пятрыкоўскі раён, Жукаў К. С. — Жыткавіцкі раён, Карачун У. Я. — Нараўлянскі раён, Гаеў Я. Я. — Ельскі раён, Карасік І. Л. — Ельск, Кісялоў П. Н.—Азарыцкі раён, Сарочанка З. І. — Ельскі раён.

На 27-VIII.

Прымака Н. І. — м. Камарын, Зіфін — Нараўлянскі раён, Шаліра Х. В. — м. Лоеў, Маркуловіч А. С. — Лоеўскі раён, Чубакоў Ф. С.—Хоцімск, Плошчаў В. А. — Брагін, Прываяв П. Я. — Брагінскі раён, Краўчэнка В. Б — Брагінскі раён, Музычэнка Р. — Брагінскі раён.

„Чырвоная Зорка“ — СОНЕЧНЫ ПАХОД. Звыш праграмы нов. амэрык. камэдыя ЧАРЛІ ЧАПЛІНА
„КУЛЬТУРА“ Пач. у 7; 8-45; 10-30 — Новы мастацкі усходні фільм СЫН КРАІНЫ. Звыш праграм. Часоп. БДК. № 15.
„Пралетары“ Адкр. з 12 г. дня. — нашумеўш. фільм паводле раману ВОЙНІЧА ОВАД. У галоўн. ролі НАТА ВАЧНАДЗЭ
„Юны Піянэр“ (будынак кіно „Культура“) С 22 жніўня — САВУР МАГІЛА. Пачатак з 1 г. дня
„СПАРТАК“ Пач. у 7, 9, 11. Каса—з 6 гадз. — КРЭСТ І МАУЗЭР. Драма ў 8 частках.

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ — З 23 жніўня і штодзенна. Мастацкі фільм. ПАЎНОЧНАЕ КАХАНЬНЕ. драма ў 7 частках. У галоўнай ролі заслужан. артыстка Карчагіна-Александроўская. Звыш праграмы КІНО-ЧАСОПІСЬ № 14. вытворчасьці БЕЛДЗЯРЖКІНО. Пачатак 1-га сэансу з 7 гадз. Каса—з 5 гадз.

XI-ты ПЛЕНУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА САВЕТУ ПРАФСЮЗАЎ БЕЛ. адкрываецца 25-га жніўня 31 г. а 6 гадз. веч., у залі пасяджэньняў ЦСПСБ (Дом працы 2-гі паверх, пак. № 10)
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Аб выкананьні прамфінпляну бягучага году і аб лімітах на 1932 год (ВСНГБ, НКСнаб, сэктар вытворчасьці і пляніраваньня).
2. Перабудова прафработы ў адпаведнасьці з рашэньнямі 5-га пленуму УсеЦСПС і вынікі месячніку самаправеркі (Арг. Інстр. Сэктар).
3. Аб перабудове спажывецкай кааперацыі і рабочым забесьпячэньні (БКС, Сац.-Быт. Сэктар).

ПРЫ БЕЛ. ТОРФ. ІНСТЫТУЦЕ АДКРЫВАЮЦЦА падрыхтоўчыя 3-месячныя КУРСЫ на 80 асоб. Прымаюцца з адукацыяй 6 гр. сямігодкі, іншыя трымаюць іспыты. Прымаюцца рабочыя дзеці і калгасьнікаў з выт. стажам ня менш 3-год. Патрэбна прадстаўленьне дакумэнтаў, згодна агульных правіл прыёму.

ГАРОЛЬД ЛЕЙД — ШПАРКАСЬЦЬ І НАЦІСК — у новай амэрыканскай камэдыі — СКОРА!

Да 1 верасьня г. г. АДКРЫЦЬ ПРЫЕМ ЗАЯЎ НА 1 КУРС ВІЦЕБСКАЙ КІНОПРАФШКОЛЫ. Кінопрафшкола падрыхтоўвае кваліфікаваных кіно-механікаў і арганізатараў кіно-справы, а таксама падрыхтоўвае ў кіно ВТУЗ. Прыём у кінопрафшколу на базе 7-годкі. Узрост ня менш 16 год. Слухачам будзе выдавацца стыпэндыя. Да заяў павінны быць прыкладзены дакумэнты: 1) пасьведчаньне аб скончаньні 7-годкі, 2) мэтрыка і 3) анкета. Адрас кіно-школы: ст. Віцебск, МБВ чыг., 3-я Чыгуначная школа ФЗС, чыгун., будынак 8. Белдзяржкіно.

ПРЫЕМ ЗАЯЎ у Беларускі Дзяржаўны Інстытут Працэсьвіных Культур на 1-шы курс працягнут да 10 верасьня 1931 г. Іспыты праводзяцца з 15 па 25 верасьня 1931 г. Заняткі распачынаюцца з 1-га кастрычніка 1931 г. Заявы з дакумэнтамі накіроўваць па адрасе: г. Горкі, Дзяржаўнаму Інстытуту Працэсьвіных Культур. Дырэктар Інстытуту Брытаў.

Іспыты для паступаючых у 3 Камуна Імя Леніна пачаліся 20 жніўня. Усім таварышом, дапушчаным да іспытаў, зьявіцца, згодна атрыманых паведамленьняў.

Нар. Ком. Аховы Здароўя абвяшчае КОНКУРС на 3 пасады ардынатараў у жаночым аддзяленьні Інстытута Аховы Матэры і Младэнцтва (пры 2 Сав. больніцы). Заявы падаваць да 30-8, Дырэктару 2-й Сав. б-цы.

Менскі Дзяржаўны Хэміка-Тэхналягічны і Тэрфіны Тэхнікум абвяшчае, што прыём заяў на сьпецыяльны набор г. г. у тэхнікум працягваецца да 26-VIII г. г. Умовы прыёму гл. газэту «Зьвязда» ад 3-VII і 7-VII і «Чырвоная Зьмена» ад 23-VII г. г. і «Рабочай» ад 8-VII г. г. Дырэктар ХТТ ЦЭМЕХМАН.

Завочныя Дзяржкурсы Росьпісу РАЗРЫСОЎКІ па ўсякага тканінах. Фарбані: рэльеф., алейн., малев. пэйзажні. (Прысыпкамі: бліскуч., бісарнючэр і інш. Спосаб: нераспляўч. анілінаў, прэзыст. росьпісу ляжнага золата, калярова серабра. Росьпіс глінян., шліф, пасуды, цэлюлёіда, скуры, дрэв. Да лекцый прыкладаецца звыш 200 малюнк. акрам тэкставых. Па скаканчэньні выд. пасьведчаньне. Уменьне малюн. не патрабуецца. Падрэбазнасьці высылі: за 20к. дробн. ашт. маркамі. Масква, вул. Дзяржынскага, д. № 1. ЗАЧОНЫЯ КУРСЫ СОНО.

КОШТ публікацыі аб згубе 1 дакумэнту 1 р.

Адказны рэдактар—С. БУДЗІНСКІ.
Галоўлітбел № 337.